Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№235 (28599)
6 СНЕЖНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 9–16



Трэнды сучаснай адукацыі
СТАР. 5



Новае аблічча вёскі
МС



Калі радавое гняздо пад пагрозай
МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«У апошнія гады ўзрасла прадстаўленасць жанчын сярод дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі. Так, у парламенцкім скліканні 2016 года доля жанчын складае 33,7%, у той час як у мінулым скліканні яна дасягала 29,7%. Хутка будуць праходзіць выбары на мясцовым узроўні, і наша агульная задача — садзейнічаць таму, каб жанчыны абавязкова мелі прадстаўніцтва ў мясцовых Саветах дэпутатаў, і не на адзінкавым узроўні. Цяпер у мясцовых Саветах жанчыны складаюць 46,3% ад агульнай колькасці дэпутатаў і ўзначальваюць больш за 30% органаў мясцовага самакіравання».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0208 | ▼ |
| Еўра | 2,3962 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0344 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0745 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АЛЬПІНІСТ МАЁРАЎ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У сталічнага індывідуальнага прадпрымальніка Сяргея МАЁРАВА незвычайная і небяспечная справа: ён — спецыяліст па прамысловым альпінізме. Шэсць гадоў Сяргей манціруе і мацуе рэкламныя банеры і расцяжкі на ўсіх мінскіх мастах і пуцеправодах. Літаральна ўчора ён развешваў плакат з сацыяльнай рэкламай каля галоўнага вакзала сталіцы. Дарэчы, сам Сяргей не курыць, таму гэты надпіс ён мацаваў з асаблівай ахвотай і натхненнем.**

■ Прамая лінія

## Чамаданчык з касметыкай ужо не вярнуць

### Як спажыўцу адстаяць свае правы?



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**З пачатку года ў Беларускае таварыства абароны спажыўцоў паступіла каля 3,5 тысячы зваротаў па тэлефоне. Было праведзена прыкладна 70 экспертыз па таварах. Пытанні ўзнікаюць самыя розныя. Ці можна вярнуць падарункавы сертыфікат? Што рабіць з каструлямі, купленымі пад уговорамі прадаўцоў на прэзентацыі? Як памяняць тавар, калі чэк на яго не захаваўся? Падчас прамой лініі ў рэдакцыі «Звязды» чытачоў кансультавала старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

СТАР. 4

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

### Як не трапіць у палонку?

**Надвор'е ў Беларусі пакрысе перастройваецца на зімовы лад. Перыяды слабаадмоўных тэмператур, якія трымаюцца суткі, чаргуюцца з рэжымам «ноччу — мінус, днём — плюс». Па папярэдніх прагнозах, ужо хутка ртутны слупок сыдзе ў пастаянны «мінус». А гэта азначае, што вадаёмы краіны ўжо цяпер замярзаюць. У чым жа небяспека першага лёду? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з вядучым спецыялістам рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алегам БАРАЗНОЙ.**

### Вызначыць па колеры

— Такое надвор'е для нас вельмі неспрыяльнае, — кажа Алег Баразна. — Калі б на двары стаяў пастаянны мароз, то лёд бы нарастаў больш-менш раўнамерна. А так атрымліваецца, па сутнасці, структура порыстага шакаладу. Ноччу, напрыклад, сантыметр-другі лёду нарос. Удзень тэмпература павысілася да нуля, і ён пачаў плавіцца. А наступнай ноччу яго зноў прыхапіў мароз. Вось з-за гэтага і ўтвараюцца мікрапусткі, якія запаўняюцца або вадой, або шугой. Але зразумела, што шуга вагу чалавека не вытрымае.

Пры пастаяннай мінусавай тэмпературы трывалы лёд можа сфарміравацца ўжо за тыдзень. На стаячых вадаёмах гэты працэс ідзе больш імкліва, а на рэках — павольней з-за наяўнасці цячэння. А вось у тых месцах, дзе прамысловыя прадпрыемствы, электрастанцыі і каналізацыйныя сцёкі скідваюць адпрацаваную гарачую ваду, лёд можа быць крохкім нават у моцныя маразы. На кар'ерах жа лёд будзе фарміравацца ўжо ў залежнасці ад тэмпературы паветра, паколькі яны адносяцца да вадаёмаў закрытага тыпу. Іншая рэч, што на іх і берагі вельмі няўстойлівыя.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДАПАМОЖАМ У БУДАЎНІЦТВЕ І ПРАЦЫ НА ЗЯМЛІ

## Краіну наведвае афіцыйная дэлегацыя Курскай вобласці

**Учора падчас сустрэчы з губернатарам гэтага расійскага рэгіёна Аляксандрам Міхайлавым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікаў больш актыўна развіваць супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, пашыраць прамысловую кааперацыю.**

— На жаль, за папярэднія гады як з Расіяй, так і з рэгіёнам тавараабарот у нас знізіўся. Аднак пазітыўныя тэндэнцыі ў гэтым годзе даюць упэўненасць у тым, што сумеснымі намаганнямі мы можам выправіць сітуацыю і аднавіць аб'ёмы ўзаемнага гандлю, — заявіў кіраўнік Беларусі.

Адным з перспектыўных кірункаў з'яўляецца аснашчэнне Міхайлаўскага горна-абагачальнага камбіната кар'ернай тэхнікай БелАЗ. Гэта адзін з самых буйных у Расіі і СНД камбінатаў па здабычы і абагачэнні жалезнай руды. Таксама сярод удзельнікаў дэлегацый — прадстаўнікі буйных прадпрыемстваў Курскай вобласці, якіх цікавіць супрацоўніцтва з «Планарам» і Мінскім маторным заводам. Што датычыцца сельскай гаспадаркі, то расійскім гасцям могуць быць карыснымі сельскагаспадарчая тэхніка, пастаўкі элітнага насення збожжавых культур і агародніны, мінеральных угнаенняў.

Беларусь цікавая курскім партнёрам і сваімі дасягненнямі ў жыллёвым будаўніцтве. «У нас ёсць вопыт Мазырскага домабудаўнічага камбіната, які ўзводзіць у вас дамы. Ведаю, што ўжо ёсць кантракт на 2018 год па будаўніцтве дома. Калі патрэбна тут большая інтэнсіфікацыя, большыя аб'ёмы, мы гатовы разгледзець і падключыць іншыя трэсты», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым наш бок жадае, каб будаўнікі-беларусы ў Расіі працавалі калектывамі, а не паасобку. А праз пэўны час айчынныя спецыялісты вузкага профілю змогуць паўдзельнічаць у будаўніцтве Курскай АЭС-2.

У сваю чаргу, расійскі губернатар Аляксандр Міхайлаў адзначыў, што знешнегандлёвы абарот сёлета вырас за 9 месяцаў у параўнанні з 2016-м амаль у паўтара раза — асабліва шчыльна суб'ект Расійскай Федэрацыі супрацоўнічае з Гомельскай і Магілёўскай абласцямі, а ў гэты візіт плануе падпісаць пагадненне з Мінскім гарвыканкамам.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

### ❍ У ТЭМУ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ** на сустрэчы з губернатарам Курскай вобласці Аляксандрам Міхайлавым акрэсліў магчымы патэнцыял у двухбаковым супрацоўніцтве. Напрыклад, расійскіх партнёраў маглі б зацікавіць электробусы і новыя тралейбусы з аўтаномным ходам. Акрамя гэтага, беларускі бок можа прапанаваць выкананне праектаў «пад ключ», пастаўляючы ў тым ліку сістэму зарадкі для такога транспарту. Карысна для абодвух бакоў было б пашырыць кааперацыйныя сувязі. Сустрэчы паміж прадстаўнікамі бізнес-супольнасцяў дапамогуць лепш зразумець магчымасці супрацоўніцтва. Дарэчы, у Курскай дэлегацыі з 45 чалавек прыкладна 30 — гэта прадстаўнікі бізнес-структур.

У наступным годзе беларускім бокам запланавана будаўніцтва ў Курску энергаэфектыўнага 140-кватэрнага жылога дома. У нас ужо ёсць вопыт супрацоўніцтва па жыллі, але мы маглі б яго пашырыць на іншыя сферы. У Курскай вобласці, як і ў Беларусі, зараз ідзе будаўніцтва АЭС. Пуск першага энергаблока запланаваны на 2021 год, у нас — на 2019. Таму беларускія будаўнікі маглі б быць прыцягнуты для працы на Курскай АЭС-2.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# Рыхтуемся да Еўрагульняў

## На самым вышэйшым узроўні быў прыняты прэзідэнт АНАК

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разлічвае на далейшае паглыбленне супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Асацыяцыяй нацыянальных алімпійскіх камітэтаў (АНАК). Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам АНАК шэйхам Ахмадам аль-Фахадам аль-Сабахам.**

«Тэма спорту сёння асабліва вострая. Вы, як член МАК (Міжнароднага алімпійскага камітэта. — **«Зв.»**), шмат што можаце расказаць, і мы пагаворым аб спорце. Я вам удзячны, што вы знайшлі час пабываць у Беларусі. Думаю, гэта не апошняя наша сустрэча, і вы часцей будзеце бываць у нас», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што Беларусь даказала здольнасць арганізоўваць мерапрыемствы сусветнага ўзроўню, і адзначыў магчымасць АНАК быць больш глыбока ўключанай у працэс падрыхтоўкі і правядзення Еўрапейскіх гульняў.

Аляксандр Лукашэнка і шэйх Ахмад аль-Фахад аль-Сабах таксама абмеркавалі тэматыку зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года, падрыхтоўку да II Еўрапейскіх гульняў, якія Беларусь прыме ў 2019 годзе, правядзенне іншых міжнародных спартыўных спаборніцтваў.

У сваю чаргу, Ахмад аль-Фахад аль-Сабах выказаў словы ўдзячнасці за актыўны ўдзел беларускай дэлегацыі ў праведзенай нядаўна ў Празе Генеральнай асамблеі Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. «Гэта было вельмі паспяховае мерапрыемства», — лічыць прэзідэнт АНАК.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Улады Аргенціны прызналі экіпаж падлодкі San Juan загінулым

Улады Аргенціны працягваюць пошукі падводнай лодкі San Juan, якая прапала 15 лістапада, аднак прызнаюць, што надзеі знайсці жывым каго-небудзь з 44 членаў экіпажа ўжо няма. Адпаведную заяву зрабіў у інтэрв'ю тэлеканалу Todo Noticias міністр абароны Оскар Агуад. Кіраўнік ваеннага ведамства таксама растлумачыў, што прынятае раней рашэнне спыніць выратавальную аперацыю і засяродзіцца на пошуках падлодкі абумоўлена тым, што, паводле справаздачы прадстаўнікоў ВМФ краіны, «экстрэмальныя ўмовы і перыяд часу, які прайшоў з моманту знікнення субмарыны, не пакідаюць шанцаў на выжыванне».

### Наследны прынц Саудаўскай Аравіі стаў «Чалавекам года» на думку чытачоў Time



Вынікі галасавання амерыканскае выданне апублікавала на сваім сайце. За манарха, які разгарнуў за мінулы месяц у сваёй краіне кампанію па барацьбе з карупцыяй, прагаласавала 24% чытачоў. На другім месцы з 6% аказаўся хэштэг #Metoo («Я таксама»), які выкарыстоўвалі ўдзельнікі руху супраць сексуальнага гвалту. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін атрымаў 3% галасоў чытачоў выдання. Ён дзеліць пятае месца з канцлерам ФРГ Ангелай Меркель, прэзідэнтам Францыі Эманюэлем Макронам, Папам Рымскім Францішкам і папулярным амерыканскім тэлевядучым Джымі Кімэла. Трамп займае шосты радок з 2% галасоў.

### У Каталоніі стартавала новая кампанія па выбарах у парламент

Пакуль апытанні прадказваюць першае месца «Сьюдаданас» («Грамадзяне»). Гэтая партыя можа атрымаць звыш 22% галасоў. «Левыя рэспубліканцы» атрымліваюць 20%. Кааліцыя, якую ўзначальвае колішні кіраўнік урада Каталоніі Карлес Пучдэмон, — на трэцім месцы з вынікам 17% галасоў. Пучдэмон ужо паведаміў, што не вернецца ў Іспанію, а будзе весці перадвыбарчую кампанію з Бруселя, дзе знаходзіцца ў дадзены момант.

### Адзін з найбуйнейшых алмазаў прададзены за $6,5 млн



Улады Сьера-Леонэ прадалі на аўкцыёне адзін з самых вялікіх у свеце неапрацаваных алмазаў, вядомы як «Алмаз міру», паведамляе Reuters. Кошт лота склаў 6,5 млн долараў, яго набыў брытанскі ювелір Лорэнс Графі. Па даных BBC, вага алмаза складае 709 карат. Ён быў знойдзены ў сакавіку бягучага года ў раёне Кона на ўсходзе краіны англіканскім пастарам Эмануэлем Мома, які перадаў яго ўраду для продажу. «Алмаз міру» лічыцца 14-м па велічыні зарэгістраваным алмазам у свеце. Ён быў прададзены з другой спробы. У маі камень быў выстаўлены на аўкцыёне ў сталіцы Сьера-Леонэ — Фрытаўне, дзе за яго прапаноўвалі больш высокі кошт — $7,8 млн. Але тады ўлады адмовіліся прадаваць алмаз, палічыўшы суму занадта маленькай.

■ Ва ўрадзе

# ЭКАНОМІКА-2018:

## без разгойдвання пачаць новы год

**Пра гэта гаварыў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, на пасяджэнні Савета Міністраў, на якім падводзіліся вынікі работы эканомікі Беларусі за мінулы перыяд гэтага года, абмяркоўваліся чаканыя вынікі 2017-га і ацэнкі студзеня 2018 года. Ён адзначыў, што пакуль па двух напрамках мы крыху адстаём ад планавых паказчыкаў — гэта прыцягненне інвестыцый і рост даходаў насельніцтва. Яшчэ ёсць час кропкава дапрацаваць там, дзе неабходна.**

За дзевяць месяцаў гэтага года прыцягнута $905 млн прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове пры заданні — $1 млрд 30 млн. Наконт росту рэальных наяўных грашовых даходаў насельніцтва адзначана, што па выніках года чакаецца выканаць паказчык і забяспечыць рост не менш за 101,3% да 2016 года. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што шмат пытанняў застаецца ў будаўніцтве, пра якое таксама ішла размова на пасяджэнні.

**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі Беларусі**, нагадаў пра задачы выйсці на паказчык росту ВУП не менш за 2% у гэтым годзе і на 3,5% — у наступным. Ён адзначыў, што задача на 2018-ы складаная, але, каб раслі даходы і пенсіі, неабходна нармальная работа эканомікі. Плённы студзень стане асновай для далейшай працы, каб потым не прыйшлося даганяць. Прамысловасць ужо выйшла з рэцэсіі, да таго ж плануецца, што пачнуць працаваць некаторыя новыя і мадэрнізаваныя прадпрыемствы.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Год навукі

# БРЭНДЫ, ЗДОЛЬНЫЯ ЗДЗІВІЦЬ

**Цэлы шэраг нарматыўных прававых дакументаў, як плануецца, будзе прыняты да II З'езда вучоных, які пройдзе ў Мінску 12—13 снежня. Сярод іх і самы доўгачаканы — указ кіраўніка дзяржавы аб удасканаленні аплаты працы работнікаў бюджэтных навуковых арганізацый.**

— Першы з'езд вучоных прайшоў у нашай краіне дзесяць гадоў таму. За гэты час шмат чаго змянілася, таму сёння важна падвесці вынікі і вызначыць далейшыя задачы, якія я асабіста ахарактарызаваў бы як дастаткова амбіцыйныя, і гэта цалкам натуральна, паколькі Беларусь мае магутны навуковы патэнцыял і развіваецца ў кантэксце сучаснай навуковай думкі, — падкрэсліў **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ** падчас прэс-канферэнцыі з нагоды меркаванай падзеі.

**Першы намеснік старшыні Прэзідыума Акадэміі навук Сяргей ЧЫЖЫК** дадаў:

— Апошнія дзесяць гадоў былі часам бурнага развіцця тэхналогій у свеце. Актыўна ўвайшлі ў наша жыццё інтэрнэт рэчаў, інфармацыйныя тэхналогіі, змяняецца структура энергаспажывання ва ўсім свеце. Мы бачым зусім іншы транспарт. І задача з'езда — абагульніць гэтыя навінкі і вызначыць прыярытэты, каб не адстаць ад іншых.

Каля 2600 дэлегатаў возьмуць удзел у з'ездзе, 500 з іх — замежныя госці.

Уладзімір Гусакоў паведаміў, што на базе навуковых арганізацый Акадэміі навук дзейнічае 16 міжнародных цэнтраў і лабараторый па распрацоўцы і адаптацыі перадавых тэхналогій і іх прасоўванні на замежныя рынкі: «Такім чынам, нам ёсць што паказаць замежным калегам і без перабольшання ёсць чым іх здзівіць, а паколькі беларуская навука ўжо мае вельмі сур'ёзныя прарыўныя распрацоўкі па розных напрамках, непасрэдна да з'езда мы падрыхтавалі спецыяльны зборнік «Брэнды Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

— Сёння навука ва ўсім свеце мае выразны практыка-арыентаваны характар, і наша краіна не выключэнне. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі — гэта магутная навукова-вытворчая карпарацыя. Важна разумець, што бюджэтныя сродкі складаюць толькі трэцюю частку ад неабходных фінансавых рэсурсаў, а ўсё астатняе нашым інстытутам і цэнтрам трэба зарабляць самім, таму мы актыўна ўдзельнічаем ва ўсіх дзяржаўных, саюзных праграмах, інавацыйных праектах міністэрстваў, ведамстваў і прадпрыемстваў, — дадаў старшыня Прэзідыума Акадэміі навук. — Таксама прыцягваем замежныя гранты, супрацоўнічаем з замежнымі навуковымі цэнтрамі. Без залішняй сціпласці магу сказаць, што ўзровень нашых спецыялістаў вельмі высокі, і мы пастаянна атрымліваем заказы на правядзенне даследаванняў і распрацовак не толькі ад беларускіх заказчыкаў, але і ад замежных партнёраў.

За апошнія пяць гадоў, дзякуючы намаганням вучоных акадэміі, было створана прыкладна тры дзясяткі вытворчасцяў інавацыйнай прадукцыі.

— Разам з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях мы распрацавалі да з'езда шэраг нарматыўных актаў, якія датычацца змянення ўмоў работы вучонага, — паведаміў **галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ.** — У яго з'явіцца больш правоў для рызыкі. Раней мы не заўсёды маглі дазволіць сабе рызыкаваць, таму што трэба было вяртаць сродкі ў бюджэт, калі распрацоўка аказвалася неэфектыўнай.

Плануецца, што галоўным дакументам, які будзе прадстаўлены на з'ездзе, стане Стратэгія развіцця навукі на 2018—2040 гады — свайго роду план работы для ўсёй навуковай галіны на некалькі дзесяцігоддзяў наперад.

### ❍ У ТЭМУ

Па інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі займаліся летась у нашай краіне 16,9 тысячы даследчыкаў у 431 арганізацыі. Узрост кожнага чацвёртага з іх (23,5%) не перавышаў 30 гадоў. Кожны пяты даследчык меў навуковую ступень.

Як і ў папярэднія гады, у прафесійнай структуры навуковых кадраў пераважалі спецыялісты ў галіне тэхнічных навук, удзельная вага якіх склала 59,6% ад агульнай колькасці даследчыкаў. Крыху больш за 20 працэнтаў былі занятыя ў галіне прыродазнаўчых навук і 7% — у галіне сацыяльна-эканамічных і грамадскіх навук.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Сацыяльны клопат

# БАЦЬКОЎСКІЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ І ЎРОКІ ПСІХАЛОГІІ

## Што трэба, каб умацаваць сям'ю?

**«Умацаванне інстытута сям'і, стварэнне ўмоў для нараджэння і выхавання дзяцей з'яўляецца для Беларусі стратэгічнай задачай. У нас сфарміравана трывалая сістэма мер эканамічнай падтрымкі бацькоў з дзецьмі, якая ўключае ў сябе розныя віды дапамогі, ільготы, гарантыі і лічыцца самай эфектыўнай на ўсёй постсавецкай прасторы», — адзначыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК падчас нацыянальнага форуму «Сям'я XXI стагоддзя».**

Ад гэтай працы ўжо ёсць добры эфект. У рэйтынгу краін, спрыяльных для мацярынства, Беларусь займае 25-е месца сярод 179 дзяржаў і першае ў СНД. Расія па гэтым паказчыку, напрыклад, на 56-й пазіцыі ў свеце, Украіна — на 69-й.

Асаблівай падтрымкай карыстаюцца шматдзетныя сем'і — такіх у краіне 95 тысяч. Так, на паляпшэнне жыллёвых умоў гэтай катэгорыі накіраваны Указ Прэзідэнта №240, які прадугледжвае фінансавую падтрымку пры пагашэнні льготных і камерцыйных крэдытаў на будаўніцтва ці рэканструкцыю жылля. Шматдзетныя бацькі таксама раз на тыдзень атрымліваюць свабодны ад работы дзень, які аплачваецца ў памеры сярэдняга дзённага заробку. З 2015 года дзейнічае сямейны капітал. Па словах Аляксандра Румака, увядзенне гэтай меры падтрымкі прывяло да росту нараджальнасці:

— Калі мы на мінулы год планавалі фінансавыя сродкі на сямейны капітал, зыходзілі з разліку ў 16 тысяч дзяцей (маецца на ўвазе трэціх і наступных. — **Аўт.**), а атрымалася 22 тысячы, што не можа не радаваць. Існуе яшчэ льготнае крэдытаванне працэдуры ЭКА: сёлета было заключана 540 дагавароў на суму 2,8 мільёна рублёў. Прынятыя захады дазволілі стабілізаваць сітуацыю ў сферы нараджальнасці. Але гэтую станоўчую тэндэнцыю нам не ўдалося падтрымаць у канцы 2016 года. Дэмаграфічная сітуацыя патрабуе пастаяннага аналізу і выпрацоўкі падыходаў да вырашэння праблем.

**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і старшыня Беларускага саюза жанчын,** заўважыла, што для беларусак дагэтуль актуальная праблема сумяшчэння прафесійных і сямейных абавязкаў. «Мы — гістарычна патрыярхальнае грамадства, і мы ад гэтага пакуль не адышлі, прайшло мала гадоў. «Шкляныя столі» для жанчын яшчэ існуюць. Ёсць і прафесійная сегрэгацыя, і разрыў у заработнай плаце ў сувязі з тым, што жанчыны працуюць у асноўным у бюджэтных сферах. Але экспертыза, якая была праведзена ў свой час Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў, пацвердзіла гендарную нейтральнасць беларускага заканадаўства. Цяпер самае галоўнае, каб гэта ўсё было рэалізавана на практыцы».

Летась БДПУ імя М. Танка сумесна з Беларускім саюзам жанчын запусцілі сацыяльна-адукацыйны праект «Здаровая сям'я — здаровая нацыя». У яго рамках правялі даследаванне адносін моладзі да сям'і і шлюбу. Было апытана 529 старшакласнікаў, 136 студэнтаў і 167 бацькоў і педагогаў.

— Школа дае ныдрэнную адукацыю, але трэба задумацца, ці вучым мы нашых дзяцей самай галоўнай мудрасці — ствараць сям'ю, — тлумачыць неабходнасць праекта **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК.** — Ці разумеюць сёння маладыя, што шлюб — гэта вялікая адказнасць? На жаль, не заўсёды. Найбольш частая прычына, праз якую распадаецца 30 працэнтаў пар, — «не сышліся характарамі». Мы ж разумеем, што за гэтым нярэдка хаваецца няўменне паважаць і разумець.

Аляксандр Жук лічыць, што ў школах добра было б увесці прадмет «Асновы псіхалогіі чалавека», хоць бы ў якасці факультатыва. Бо вывучаць самія сябе не менш важна, чым геаграфію і гісторыю. Яшчэ адна важная задача — павышэнне псіхолага-педагагічнай адукаванасці бацькоў.

— Без гэтага мы не зможам прасунуцца ў вырашэнні праблем сям'і, — упэўнены рэктар педуніверсітэта. — Дазвольце прывесці трывожную статыстыку. У 2015 годзе ў краіне было 17 выпадкаў суіцыду сярод непаўналетніх, а ў 2016-м — 29. Летась спецыялісты зафіксавалі 244 спробы самагубства сярод падлеткаў. Адной з прычын, праз якую дзеці вырашаюць пайсці з жыцця, з'яўляецца парушэнне сямейных адносін. 70 працэнтаў падлеткаў пасля суіцыдальнай спробы кажуць, што не могуць звярнуцца па дапамогу да сваіх таты і мамы.

Менавіта таму ў школах неабходна стварыць бацькоўскія ўніверсітэты. БДПУ ўжо распрацаваў праект праграмы і будзе ўносіць свае прапановы ў Міністэрства адукацыі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ХОЧАЦЦА ДВАІХ, А МАЕМ...

## Вышэйшая адукацыя і пражыванне ў вялікіх гарадах не спрыяюць дзетанараджэнню

**З'явіліся першыя вынікі ўнікальнага сацыялагічнага даследавання «Беларусь: структура сям'і, сямейныя стасункі, рэпрадуктыўныя паводзіны», праведзенага сёлета па метадалогіі міжнароднай праграмы ЕЭК ААН «Пакаленне і гендар». Іх ужо аналізуюць беларускія сацыёлагі, эканамісты, дэмографы і медыкі. Двухтомную калектыўную манаграфію плануецца апублікаваць налета.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падобныя даследаванні ахапілі 25 краін. Іх мэтай стала вывучэнне працэсаў фарміравання сям'і, нараджальнасці, узаемадзеяння паміж пакаленнямі, ролі мужчын і жанчын у сямейным жыцці. Вынікі павінны дапамагчы прыняць навукова абгрунтаваныя праграмы ў галіне народанасельніцтва.

— Чым пазней нараджаецца першае дзіця, тым меншая колькасць дзяцей у сям'і, — заўважыў падчас прэзентацыі папярэдняй справаздачы **дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ Давід РОТМАН.** — Пры гэтым доля беларускіх жанчын, якія нараджаюць дзяцей у малодшай узроставай групе, істотна скарачаецца. З павелічэннем узроўню адукацыі зніжаецца імавернасць нараджэння другога і трэцяга дзіцяці. На нараджэнне аднаго дзіцяці гэты фактар не ўплывае — да канца фертыльнага ўзросту каля 90 працэнтаў жанчын маюць хоць бы адно дзіця. Значным фактарам нараджальнасці з'яўляецца, напрыклад, месца пражывання: чым больш населены пункт, тым ніжэйшая імавернасць з'яўлення наступных дзяцей. Старэйшае пакаленне, якое нават не пражывае разам з маладой сям'ёй, як правіла, дапамагае даглядаць непаўналетніх дзяцей, асабліва ў першы год жыцця. З часам аб'ём дапамогі зніжаецца. Працэнт дзяцей і ўнукаў, якія дапамагаюць састарэлым бацькам, павялічваецца з узростам: 21 працэнт рэспандэнтаў дапамагаюць сваім 75—79-гадовым бацькам...

Як высвятляецца, каля 70 працэнтаў нашых жанчын да 24 гадоў маюць вопыт пастаянных стасункаў з партнёрам, каля 50 працэнтаў — вопыт сумеснага пражывання. Мужчыны і жанчыны з вышэйшай адукацыяй пазней уступаюць у першы шлюб. Калі ва ўзросце 18—26 гадоў доля жанчын, якія маюць намер у найбліжэйшыя тры гады нарадзіць дзіця, узрастае, то ў групе тых, каму ад 27 да 44, гэта доля скарачаецца.

Большасць жанчын арыентаваныя на нараджэнне хоць бы аднаго дзіцяці да 29 гадоў. Ва ўзросце 27—29 гадоў усяго 14 працэнтаў жанчын не плануюць мець дзяцей. У той жа час каля 40 працэнтаў жанчын плануюць да 29 гадоў нарадзіць другое дзіця.

Ва ўзросце 39—41 года каля 65 працэнтаў жанчын плануюць нарадзіць дваіх, яшчэ 25 працэнтаў — траіх. Фактычныя ж паказчыкі нараджальнасці значна адстаюць ад установак, прычым дысбаланс паміж намерам і паводзінамі пачынае ярка праяўляцца пасля 27 гадоў.

Сярэдні ўзрост нараджэння першынца для жанчын складае 24 гады, для мужчын — 27. Самая высокая сярэдняя колькасць народжаных дзяцей у разліку на адну жанчыну — у сельскай мясцовасці.

Большасць рэспандэнтаў — як мужчын, так і жанчын — лічаць, што пытанні грашовага забеспячэння сям'і ўваходзяць у зону адказнасці мужчын. 40 працэнтаў мужчын і 41 працэнт жанчын мяркуюць, што клопат пра дом і дзяцей больш значны для жанчын.

У межах апытання сваю задаволенасць жыццём, жыллём і работай рэспандэнты абазначалі па 10-бальнай шкале. Ва ўсіх узроставых групах найменшы агульны сярэдні бал быў характэрны для тых, хто не мае пастаяннага партнёра і дзяцей, найбольш высокі — сярод тых, у каго ёсць і партнёр, і дзеці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

**Апытанне праведзена Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта разам з Нідэрландскім міждысцыплінарным дэмаграфічным інстытутам у 56 гарадах і 40 населеных пунктах. Звыш 300 інтэрв'юераў апыталі больш за 10 тысяч чалавек ва ўзросце ад 18 да 79 гадоў. Даныя пазначаліся на электронных планшэтах. Даследаванне фінансуецца ўрадам Расіі, Фондам ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ).**

# ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праверыць якасць пакрыцця можна свярленнем. Для гэтага трэба ўзброіцца звычайным рыбацкім ледабурам. Бяспечная таўшчыня пачынаецца ад сямі сантыметраў. Калі ж на лёд выходзяць некалькі людзей, то гэтая велічыня роўная ўжо 10—12 см пры ўмове, што тыя, хто знаходзіцца на замерзлым вадаёме, стаяць на метровай адлегласці адно ад аднаго. Акрамя таго, трывалы лёд мае ярка-белы або крыху блакітны колер. Калі ж ён пачынае разбурацца, то колер мяняецца на больш цёмны.

## Рызыкоўная рыбалка

У 2015 годзе вясна наступіла вельмі рана. 8 сакавіка выдалася цёплым сонечным днём, і, нягледзячы на гэта, на Чыжоўскае вадасховішча ў Мінску пацягнуліся рыбакі. Раздаўся трэск лёду — і двое з іх праваліліся ў халодную ваду. Аднаго ўратаваць не паспелі. Гэтая трагедыя тады разгортвалася на вачах у карэспандэнта «Звязды».

**Сёлета за першыя месяцы года лёд адабраў жыцці 8 чалавек. Пяцёра з іх — рыбакі. У сваю чаргу, чацвёра з іх былі ў нецвярозым стане. Яшчэ трое патанулі пры пераходах.**

Але ахвярай тонкага лёду могуць стаць і тыя людзі, якія зразаюць праз вадаёмы дарогу. Масты знаходзяцца не заўжды ў зручных месцах.

— Нам шмат праблем дастаўляюць узімку рыбакі, — працягвае Алег Баразна. — Яны вудзяць як седзячы на лёдзе, так і выходзячы на незамерзлую ваду на плавальных сродках. Каля прамоін заўжды збіраецца рыба, бо там у ваду паступае кісларод. Аднак тут ёсць адно «але». У нас вельмі распаўсюджаны надзіманыя лодкі. Кромка лёду, як правіла, вострая, і прапароць тую гуму яна здольная на раз-два. А калі рыбакі напароліся на такі «міні-айсберг» дзе-небудзь пасярэдзіне возера? Тэмпература вады ў зімовым вадаёме складае максімум плюс два-тры градусы. І пры такіх умовах хопіць трох-чатырох хвілін, каб мышцы замерзлі канчаткова.

Як жа правільна дапамагчы небараку, які праваліўся пад лёд?

— Першае правіла — не саромецца клікаць на дапамогу яшчэ кагосьці з-за вельмі абмежаванага часу. І, вядома ж, загадзя вазьміце з сабой якую-небудзь доўгую жардзіну, шалік, запасную куртку — адным словам усё тое, што вы зможаце падаць чалавеку, які цярпіць бедства. Яшчэ адна памылка, якая можа скончыцца смерцю таго, хто ратуе, — бегчы па лёдзе ў поўны рост. Калі чалавек праваліўся, значыць, лёд там крохкі. І таму падбірацца трэба па-пластунску. Чым большая плошча, якую пакрывае цела, тым меншы ціск на покрыва — закон фізікі. Менавіта таму мы і раім выходзіць на лёд разам з кімсьці. Бо калі здарыцца бяда, а вы пасярэдзіне ракі адзін, то на каго вам разлічваць?

**Летась на крохкім лёдзе патанулі 26 чалавек, з іх адзін — непаўналетні. Адметна, што з іх 23 былі рыбакамі, а астатнія вырашылі зрэзаць дарогу.**

Пасля таго як чалавека выцягнулі на бераг, яго трэба як мага хутчэй даставіць у любое цёплае памяшканне, зняць мокрую вопратку і расцерці цела. Снег у гэтай справе — памочнік дрэнны. Пажадана напаіць пацярпелага гарачай гарбатай і ні ў якім разе не саджаць у гарачую ванну.

— Рыбакам трэба экіпіравацца наступным чынам, — працягвае Алег Баразна. — Абавязкова ўзяць з сабой вяроўку і лядовыя штыры. Калі вы праваліліся пад лёд, то з дапамогай гэтых канструкцый вы зачэпіцеся за яго кромку і вылезеце на паверхню. Таксама павінна быць пры сабе ратавальная камізэлька, якая будзе падтрымліваць на вадзе.

## Выцягнулі? Заплаці!

— У краінах Балтыі, Расіі працуе спецыяльны закон. Ён устанавіў штрафныя санкцыі за знаходжанне на акваторыі вадаёма падчас ледаставу або разбурэння пакрыцця. Калі нехта ў гэты час праваліцца ў ваду, то будзе вымушаны пасля кампенсаваць усе затраты на сваё выратаванне. Штраф можа даходзіць да некалькіх соцень еўра. У нас жа пакуль што гэтая ініцыятыва застаецца на ўзроўні законапраекта.

Летась на крохкім лёдзе патанулі 26 чалавек, з іх адзін — непаўналетні. Адметна, што з іх 23 былі рыбакамі, а астатнія вырашылі зрэзаць дарогу.

Сёлета за першыя месяцы года лёд адабраў жыцці 8 чалавек. Пяцёра з іх — рыбакі. У сваю чаргу, чацвёра з іх былі ў нецвярозым стане. Яшчэ трое патанулі пры пераходах.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*



# Чамаданчык з касметыкай ужо не вярнуць


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Чэк — не адзіны доказ куплі

☎ ***Купіла святлодыёдную лямпачку, а яна перагарэла. Чэк не захавала, толькі гарантыйны талон і ўпакоўку. Магу я лямпачку вярнуць?***

— Можаце. Гарантыйны талон і ўпакоўка — дастатковая падстава, каб даказаць, што вы купілі лямпачку ў пэўнай краме. У новай рэдакцыі Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў» (яна прайшла ўжо першае чытанне) паняцце дакумента, які пацвярджае набыццё тавару ці выкананне паслуг, будзе пашырана. У яго ўключаць не толькі чэк, але і належным чынам аформлены тэхнічны пашпарт, інструкцыю па эксплуатацыі і нават праязны білет.

☎ ***Гэта турбуюць з Дзятлава Гродзенскай вобласці. Званю па просьбе свайго мужа, Сёмухі Тадэвуша Вацлававіча. Ён купіў у прадпрымальніка запчастку — галоўку рухавіка. Яна аказалася няспраўнай. Муж прынёс яе назад прадаўцу, а той сказаў: «Калі прадам, тады аддам грошы». Прайшло ўжо больш за год. Прадпрымальнік вазіў у Мінск гэту запчастку, правяраў, кажа, што спраўная, але нам не хоча аддаваць ні галоўку, ні грошы, пакуль не заплацім за тое, што ён патраціўся на дарогу.***

— Калі прадавец прыняў тавар, ён абавязаны вярнуць яго кошт у тэрмін не больш як сем дзён (такая норма прапісана ў Законе «Аб абароне правоў спажыўцоў»). Паколькі справа зацягнулася, то ў вас ёсць права патрабаваць няўстойку — адзін працэнт ад кошту тавару за кожны пратэрмінаваны дзень. Вы павінны напісаць заяву на імя прадаўца. У кожным райвыканкаме ёсць упаўнаважаны па абароне правоў спажыўцоў, як правіла, у аддзеле эканомікі або гандлю — звярніцеся да яго, каб дапамог афарміць прэтэнзію. У ёй вы ўстанаўліваеце тэрмін не больш за 14 дзён для кампенсацыі вашых затрат. Заяву можна адправіць заказным лістом ці з паведамленнем.

Калі гэта не падзейнічае, трэба звярнуцца ў суд. Пры падачы іску спажывец не плаціць дзяржаўную пошліну, усе выдаткі кладуцца на прадаўца.

***— Куды мы толькі ні звярталіся: і ў падатковую, і ў пракуратуру...***

— Падатковыя і іншыя органы не займаюцца гэтым. Не трэба хадзіць ні ў міліцыю, ні да пракурора. У іх іншыя абавязкі.

***— Разумееце, у нас няма чэка. Але, калі падатковы інспектар выклікаў прадпрымальніка, той прызнаўся, што прадаў нам запчастку. Толькі нам акт апытання не даюць. А нам бы грошы вярнуць. 180 долараў для нас, пенсіянераў, сума вялікая.***

— Мясцовы выканкам можа запрасіць гэты дакумент, каб у вас былі важкія доказы, што прадпрымальнік прадаў вам пэўны тавар.

## Званок прадаўцу не лічыцца — шліце пісьмо

☎ ***Пытанне з Мінска. На распродажы ў ДК купіла паліто, а яно з бракам. Як яго вярнуць? Распродаж працягваўся толькі пару дзён і ўжо скончыўся, ДК пусты.***

— Вы не ў ДК купілі, а ў канкрэтнага прадпрымальніка ці фірмы. Калі набывалі паліто, абавязкова трэба было ўзяць чэк або распіску: там стаіць найменне прадаўца. Даведацца пра яго месцазнаходжанне, каб адправіць заяву, можна ва ўпраўленні Адзінага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў Міністэрства юстыцыі (Кальварыйская, 1, каб. 705). Інфармацыя даецца бясплатна, але не па тэлефоне — трэба прыйсці асабіста.

☎ ***Падкажыце, якія тавары добрай якасці нельга вярнуць на працягу 14 дзён?***

— Гэта харчовыя тавары, метражныя тканіны, шпалеры, нацельная бялізна, аўтамабілі, мэблевыя гарнітуры і наборы, парфумерна-касметычныя тавары, лекі, тавары заакрам, кветкі і іншае. Нельга вярнуць таксама тэхнічна складаныя тавары бытавога прызначэння, якія маюць гарантыйны тэрмін і ў тэхнічным пашпарце якіх зроблена адзнака аб даце продажу: напрыклад, ноўтбукі, тэлевізары, мікрахвалёўкі. Цацкі, інструменты для манікюру і бытавая хімія таксама ўваходзяць у гэты спіс, але калі яны былі ў герметычнай упакоўцы, то іх можна абмяняць.

☎ ***Гарадскі пасёлак Старобін турбуе. У верасні купіў кольцы для каналізацыі. Пачалі ў ліставпадзе манціраваць, а яны аказаліся няякаснымі. Якія дакументы і куды накіраваць, каб мне кольцы памянялі? Размаўляў з прадаўцом па тэлефоне, ён адцягвае сустрэчу.***

— Вам трэба адправіць пісьмовае патрабаванне аб вяртанні грошай за няякасны тавар па адрасе прадаўца. Званок не лічыцца: вы не дакажаце потым, што давялі гэты факт да ведама прадаўца. Яму адводзіцца сем, а калі патрабуецца дадатковая праверка якасці, то 14 дзён, не больш. Тэрмін пачынае адлічвацца з моманту ўручэння вашага пісьма.

Доказ таго, што самаўды маецца дэфект, выдаецца пасля правядзення экспертызы. Яе робіць той, хто зацікаўлены, — звычайна спажывец. Ён абавязаны будзе аплаціць працэдуру і потым разам з коштам тавару можа патрабаваць у прадаўца вярнуць гэтыя затраты. Калі экспертыза браку не выявіла, выдаткі на яе правядзенне спажыўцу не кампенсуюцца.

☎ ***Ці можна вярнуць у краму падарункавы сертыфікат?***

— Нельга. Гэта, па сутнасці, перадаплата на тавары, паслугі. Калі вы забыліся своечасова скарыстацца сертыфікатам, тэрмін дзеяння таксама нельга перанесці.

## За вываз смецця плаціць абавязкова

☎ ***Калі ў цырульні зрабілі стрыжку, а яна мне не спадабалася, ці магу я не плаціць за яе?***

— Трэба звярнуцца да адміністрацыі цырульні і спрабаваць дамовіцца. Варта прымаць пад увагу, што стрыжка залежыць ад структуры валасоў, формы галавы. Ведаю выпадак, калі маладая жанчына ўжо перад сушкай адчула, што атрымала не тое, што хацела, адразу заявіла пра гэта, і цырульнік усё перарабіў. Але гэта заўсёды вельмі складанае пытанне.

☎ ***Нядаўна куплялі кватэру і наймалі для гэтага рыэлтара. Знайшлі патрэбнае жыллё. А потым аказалася, што мы павінны заплаціць не толькі свайму агенту, але і таму, каго наймаў прадавец кватэры. За што? Ён нават не з'явіўся на перадачу ключоў!***

— Трэба было ўважліва чытаць дагавор: хутчэй за ўсё, там быў дадатковы пункт аб аказанні рыэлтарскіх паслуг. Але ніхто не мае права адмовіць вам у продажы кватэры, калі вы не хочаце плаціць чужому агенту. Бо ён і так атрымлівае ўзнагароду ад свайго кліента. Увогуле, уважліва вывучайце, што набываеце. Часта прадаўцы кватэр запрашаюць на сустрэчу ў пэўны час, калі няма праблемных сітуацый, а потым аказваецца, што, напрыклад, шумаізаляцыя дрэнная і чуваць, як грукочуць электрычкі.

☎ ***У нас у пад'ездзе правадзілі апытанне: ці згодны мы, каб смеццеправод заварылі і замест гэтага паставілі кантэйнеры для асобнага збору адходаў. Большасць жыльцоў выказалася «за». Але я супраць, мне было смеццеправодам зручней было. Магу я адмовіцца плаціць за вываз адходаў, калі не даваў сваёй згоды?***

— Вываз цвёрдых бытавых адходаў — гэта абавязковая паслуга, таму адмовіцца ад яе немагчыма. Цяпер наконт гэтага вельмі шмат пытанняў узнікае і ў сельскіх жыхароў, якія не хацелі б плаціць. Але адказ той жа. Вядомы выпадак, калі вясковец самастойна асобна збіраў смецце: дрэва спальваў у печы, макулатуру здаваў у школу, поліэтылен і пластмасу таксама адвозіў у пункт прыёму. У яго нават былі квітанцыі, але, на жаль, суд не падтрымаў спажыўца, не палічыў гэтыя довады пераканаўчымі.

☎ ***Хачу купіць пуцёўку на мора, але, калі пачытала навіны пра землятрус на Балі, задумалася. Калі ў краіне, куды збіраюся, здарыцца нешта надзвычайнае, ці змагу за пару дзён да адлёту адмовіцца ад пуцёўкі і патрабаваць вярнуць яе кошт?***

— У такім выпадку вам павінны будуць вярнуць суму за вылікам рэальна панесеных расходаў (напрыклад, афармленне візы, браніраванне білетаў). Звычайна турфірмы ідуць насустрач.

## Кошык пакіньце ў краме

☎ ***Трапіў у такую сітуацыю. Купіў прадукты, у кошыку выразаў данесці да свайго аўтамабіля. На шляху дагнаў ахоўнік і, абвінавацўшы ў крадзяжы, патрабаваў вярнуць кошык.***

— Ахоўнік меў рацыю. Кошык з'яўляецца ўласнасцю крамы, і выносіць яго нельга. Але ў гіпермаркетах звычайна ёсць спецыяльныя каляскі — на іх можна давозіць пакупкі да машыны.

☎ ***Не раз бачыла такія аб'явы: «Крама не нясе адказнасці за рэчы, пакінутыя ў камерах захоўвання». Як жа так? І пры гэтым у гандлёвы зал з вялікімі торбамі не пускаюць.***

— Такія аб'явы не маюць законнай сілы. Гэта няправільная пазіцыя. Вы прыйшлі на тэрыторыю дадзенай крамы, даручылі ёй захоўваць вашы рэчы, таму ў выпадку непрадбачанай сітуацыі (калі іх укралі), у вас ёсць поўнае права звярнуцца да адміністрацыі гандлёвага аб'екта па кампенсацыю панесеных страт.

☎ ***У нас у суседняй краме бывае блытаніна з цэнамі. На цэнніку прачытаеш адну суму, а на касе прабіваюць іншую. Калі кажу пра гэта прадаўцу, ён адказвае, што нічым не можа дапамагчы.***

— Калі справа ў тым, што крама не паспела змяніць цэннікі, яна павінна пайсці насустрач і ануляваць суму. Але, бывае, спажывец сам памыляецца. Запомніце: на цэнніку абавязкова прысутнічаюць апошнія тры лічбы штрых-кода тавару. Гэта добрая падказка, калі незразумела, які кошт да чаго адносіцца.

☎ ***Маю маму на мінулым тыдні запрасілі на прэзентацыю посуду. Нейкія там суперкаструлі, якія каштуюць шалёных грошай. Угаварылі купіць набор у растэрміноўку. Мама каструлі дадому прынесла, а на наступны дзень у роспачы пазваніла мне: як іх вярнуць? Ці можна што-небудзь зрабіць?***

— Калі посуд не выкарыстоўваўся, спажывец мае права яго вярнуць на працягу 14 дзён. Рэкамендую гэтым прадаўцам паслаць тэлеграму з прыпіскай: «Тавар не падышоў, прашу вярнуць кошт, набор будзе ўручаны ў момант чарговай прэзентацыі, якая будзе праходзіць у маім горадзе». Дагавор растэрміноўкі таксама можна ануляваць.

Гэтыя каструлі, дарэчы, прызначаны для індукцыйных пліт. І калі чалавек у якім-небудзь пасёлку набыў іх і паставіў на газавую пліту, посуд расплавіцца. Адзінае, што можна зрабіць у такім выпадку, — паглядзець, ці даў прадавец поўную інфармацыю аб выкарыстанні каструль.

Нашы спажыўцы не навучыліся казаць «не» навязліваму сэрвісу. І калі лячэбныя вусцілкі, падушкі і коўдры яшчэ можна вярнуць, то чамаданчыкі з цудадзейнай касметыкай — не. Кампаніі ўжо ўлічылі свае промахі і, заключаючы дагаворы, стараюцца ўсё прапісаць. Таму трэба думаць загадзя.

☎ ***Цяпер крамы распрадаюць вясеннія калекцыі абутку. А з якога моманту на яго пачынаецца гарантыя?***

— Для абутку сезонная прызначэння гарантыйныя тэрміны носкі вылічваюцца наступным чынам: для зімняга абутку — з 15 лістапада, вясенняга — з 1 сакавіка, восеньскага — з 15 верасня, летняга — з 1 мая. Спартыўны абутак і мадэльныя туфлі лічацца пазасезоннымі. Але калі спажывец пачаў насіць чаравікі адразу пасля куплі, то гарантыя дзейнічае з моманту іх выкарыстання.

Усім хачу параіць: не рабіце неабдуманых пакупкі. Перш чым даставаць кашалёк з кішэні, палічыце хоць бы да пяці і падумайце, ці патрэбна вам гэта рэч.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Тэхналогіі

# Без чэргаў і незразумелых канцылярызмаў

## Сабраць даведкі дапаможа ўсёведная камп'ютарная праграма

**Як паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама, Адзіны разлікова-даведачны цэнтр Мінска і КУП «Мінскае гарадское агенцтва абслугоўвання насельніцтва», спецыялісты якога прымаюць дакументы ў службах «Адно акно», пачалі супрацоўніцтва з адным са сталічных стартапаў — чат-ботам пад назвай "Док-Менеджар".**

Мабільная праграма дапамагае істотна сэканоміць час як гараджанам, так і работнікам службаў. Знайсці яе можна ў месенджары Telegram, які ёсць магчымасць спампаваць на смартфон, планшэт або камп'ютар.

— Бот эканоміць час на тыпавых працэдурах і расказвае просты мовай юрыдычную інфармацыю, каб любы чалавек разумеў, што рабіць. Напрыклад, спачатку трэба пайсці ў адну ўстанову і падаць вось такія даведкі, потым у іншую — вось вам шаблон для заявы. Калі трэба плаціць пошліну, бот пакажа, дзе знаходзіцца найбліжэйшы банк. «Док-Менеджар» пакуль не можа зрабіць за вас усё, але прыкметна спрашчае збор і падрыхтоўку дакументаў, — каментуе навінку **кіраўнік праекта «Док-Менеджар» Арцём САМКІН.**

На дадзены момант бот можа дапамагчы справіцца з 16 працэдурамі. Ён дае спіс дакументаў, якія трэба сабраць — да самай дробнай даведкі, — высылае ўзоры заяў для запаўнення, паказвае на карце банкі і ўстановы, паведамляе, калі прыйсці па вынік. Калі ў найбліжэйшы час вам трэба, напрыклад, зарэгістраваць машыну, замяніць пашпарт, зняць ці здаць жыллё, запісаць дзіця ў дзіцячы сад, зарэгістравацца і закрыць ІП — смела звяртайцеся да праграмы, якая ніколі не адмовіць, па параду.

У адрозненне ад спецыяліста, які лепш за ўсё разбіраецца ў нейкім адным кірунку, чат-бот ведае адказы на ўсе пытанні — яго распрацоўкай займаецца каманда прафесійных юрыстаў, да якіх нядаўна далучыліся работнікі Адзінага разлікова-даведачнага цэнтра Мінска.

Тым, хто здымае ці здае жыллё, «Док-Менеджар» дапаможа заключыць дагавор найму: вышле бланк дагавора, дасць інфармацыю, як правільна яго скласці, і нават пакажа адрас разлікова-даведачнага цэнтра, дзе дагавор можна зарэгістраваць. Бот раскажа аб усіх нюансах падачы іску ў суд, дапаможа самім скласці іскавую заяву і растлумачыць, у які суд звярнуцца. А ахвотным стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў дасць кансультацыю аб парадку пастаноўкі, раскажа пра тых, хто мае пры гэтым прывілеі.

Работа над праграмай не завершана: зараз займаюцца даданнем у спіс працэсу атрымання аднаразовай і штомесячнай дапамогі на дзяцей. У далейшых планах — уключыць у «Док-Менеджар» поўны пералік працэдур службаў «Адно акно».

**Дар'я КАСКО.** kasko@zviazda.by ■

■ Класныя навіны

# Ешче слана па кавалках,

## або Феерверк педагагічных ідэй

### Чым настаўнікі-метадысты будуць здзіўляць на сваіх майстар-класах?

**27—28 снежня ў сталіцы пройдзе VII Рэспубліканскі калядны фестываль педагагічнага майстэрства. Ініцыятыва яго правядзення належыць Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Беларускаму педагагічнаму таварыству. Кожны год у цэнтры ўвагі ўдзельнікаў фестывалю аказваецца тэма, якая бачыцца ўсім найбольш актуальнай. Сёлета яго дэвіз «Досвед найлепшых — здабытак кожнага». Папулярнасць гэтага абсалютна добраахвотнага мерапрыемства сярод педагогаў проста «вірусная». Летась рэгістрацыя для ўдзелу ў фестывалі завяршылася на сайце Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ўсяго праз два дні: за гэты час амаль чатыры з паловай сотні педагогаў запоўнілі ўсе вакантныя месцы. Сёлета рэгістрацыя распачнецца 11 снежня. Колькасць удзельнікаў фестывалю абмежаваная, таму, каб трапіць у кола шчаслівчыкаў, трэба трымаць руку на пульсе...**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**А напярэдадні адказнай падзеі члены Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў Рэспублікі Беларусь «Імкненне» арганізавалі мазгавы штурм, прадумваючы, што яны могуць прапанаваць сваім калегам.**

## Званне, якому трэба адпавядаць

— Вельмі хочацца верыць, што людзі, якія тут сабраліся, не спыняцца ў сваім развіцці. Рухаць наперад школу і ствараць перадумовы для яе развіцця можа толькі неабыякавы чалавек, — падкрэслівае **начальнік упраўлення вучэбна-метадычнай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ала СЕМЯНОВІЧ.** — Таму трэба быць неабыякавымі да ўсяго вакол, а не толькі да таго, што адбываецца ў канкрэтнай установе адукацыі.

— Ці можам мы сёння казаць, што катэгорыя «настаўнік-метадыст» — гэта брэнд? — разважае **Інэса ЗУБРЫЛІНА, кіраўнік Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне», пераможца рэспубліканскага конкурсу педагагічнага майстэрства «Настаўнік года — 2011», старшы выкладчык Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, настаўнік англійскай мовы мінскай гімназіі №24.** — Мы даўно заўважылі, што настаўнікаў прыцягвае нават не тэма майстар-класа, а імя педагога, які яго праводзіць. І з году ў год з адной і той жа папкай у аўдыторыю да калег ты не пойдзеш. Для нас гэта моцны матыватар да пастаяннага развіцця і прафесійнага росту. Несумненна, мы будзем дзяліцца на фестывалі ўласным досведам, але спыняцца толькі на сваім развіцці нам яшчэ ранавата. Не толькі нашы вучні павінны быць канкурэнтаздольныя, але і мы з вамі. Нягледзячы на нашы «пагоны», мы павінны развівацца ў рэчышчы тых сусветных адукацыйных трэндаў, якія сёння ўваходзяць у першую дзясятку, і весці ўсіх за сабой.

## Пра складанае — даступна і проста

Якія ж ідэі сёння знаходзяцца ў цэнтры ўвагі педагогаў ва ўсім свеце?

**Перакуленае навучанне.** Уяўляе сабой адну з формаў змешанага навучання. Замест хатняга задання навучэнцы глядзяць кароткія відэалекцыі ў сеціве, самастойна праходзяць дома тэарэтычны матэрыял, а ўвесь аўдыторны час, калі побач знаходзіцца настаўнік ці выкладчык, выкарыстоўваецца для сумеснага выканання практычных заданняў.

**Сторытэлінг (storytelling)** — спосаб данясення да аўдыторыі інфармацыі праз расказ гісторый з рэальнымі ці выдуманымі персанажамі. Мы ўсе любім, калі пра складанае расказваюць проста. Але як гэта зрабіць? З дапамогай канкрэтнага прыкладу, займальнай гісторыі. Па-першае, гісторыі павінны перасякацца з жыццёвым вопытам. Па-другое, любая гісторыя павінна мець лагічнае завяршэнне, якое падштурхне вучняў да высновы. Расказаныя гісторыі матывуюць і падахвочваюць да дзеяння. Сторытэлінг — напрамак, які цяпер вельмі моцна раскручваецца, як і гейміфікацыя адукацыі.

**Гейміфікацыя** — моцны інструмент для павелічэння індэкса ўцягнутасці ў адукацыйны працэс (гэта можа быць, напрыклад, навучанне з дапамогай мабільнага тэлефона або вэб-квэсту).

13.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок не позднее 01.03.2018.

13.3. Имена победителей Рекламной игры будут размещены на Интернет-сайте: www.alfabank.by.

13.4. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте www.alfabank.by, а также по телефону контакт-центра «Альфа-Консультант»: 198, +375 (29, 44, 25) 733 33 32 круглосуточно.

**14. Прочие условия.**

14.1. Организатор не вступает в споры между Участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза, организации и условий передачи Призов. Приз получает Победитель. Победитель вправе распорядиться полученным призом по своему усмотрению.

14.2. Участие в Рекламной игре автоматически подразумевает ознакомление с полным текстом настоящих Правил и согласие Участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником настоящих Правил считается его отказом от участия в Рекламной игре со всеми вытекающими последствиями (включая утерю права на получение приза и т. п.).

14.3. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются принимать участие в рекламной видеосъемке, что их фамилии, имена, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Заинтересованному лицу.

14.4. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

14.5. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, офис 509.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №3169 от 4 декабря 2017 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарошчая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## ЗІМОВЫ КРОП НА ПАДАКОННІКУ

**Цяпер нават зімой на прылаўках шмат свежай зеляніны, але, на жаль, яна хоць і выглядае цалкам прыстойна, але на смак — трава травой. Як бы ні стараліся вытворцы, але прырода распарадзілася так, што ўвесь комплекс карысных і водарных рэчываў у зеляніны захоўваецца толькі на працягу 2 гадзін пасля зрэзкі.**

Таму добра, калі на кухонным падаконніку заўсёды стаяць прыгожыя гаршкі з духмянымі раслінамі. Але вось толькі кроп, у адрозненне ад іншых, не вельмі хоча пераходзіць у разрад пакаёвых раслін. Пры звычайным пасеве насенне ўзыходзіць дрэнна, сеянцы атрымліваюцца кволыя. Каб выправіць сітуацыю, можна скарыстацца не зусім звычайным падыходам.

Напоўніце кантэйнеры глебай, пасейце насенне кропу і пакіньце ў халодным месцы тыдні на 2. Пажадана, каб тэмпература там была каля 0 °С ці на некалькі градусаў ніжэйшая. Прамерзлая глеба стымулюе насенне: усходжасць атрымліваецца ледзь не стапрацэнтная, ды і самі расліны вырастаюць моцныя, кусцістыя, з яркай сакавітай зелянінай.

## ЯК ДАГЛЯДАЦЬ ХВОЙНЫЯ ЎЗІМКУ



**Хвойныя дрэвы і кусты — гэта, бадай, адны з самых непатрабавальных раслін. Пышная зялёная крона ўпрыгожвае іх круглы год. Елка, сасна, лістоўніца і ядловец устойлівыя да хвароб і шкоднікаў, не баяцца халадоў. Але ўсё ж зусім пазбаўляць вечназялёныя дрэвы ўвагі не варта. Узімку яны маюць патрэбу ў кроплі вашага цяпла і клопату, а яшчэ ў абароне ад падступных «агрэсараў».**

### *Іх зімовыя ворагі*

Вельмі небяспечнымі для вечназялёных раслін могуць стаць наступныя фактары.

**Ліпкі снег.** 3-за вялікай колькасці ліпкага снегу галіны могуць ламацца. Каб гэтага не здарылася, страсайце яго пасля снегападаў. Можна скарыстацца звычайнай дошкай, абгорнутай тканінай.

**Яркае сонца.** Зімовае сонца можа высушыць расліну або стаць прычынай апёку. Сімптомы высушвання — пажоўкласць і абескаляроўванне ігліцы. У гэтым выпадку прыцяніце крону і некалькі разоў паліце цёплай вадой. Калі тэмпература паветра падымецца вышэй за 10 °С, апрацуйце ігліцу адным з прэпаратаў — стымулятараў росту: эпін, цыркон, НВ 101 ці інш.

**Ледзяны дождж.** Пасля выпадзення такіх ападкаў надайце галінам першапачатковае палажэнне пры дапамозе падпорак. Не спрабуйце штучна растапіць лёд цёплай вадой або нават фенам.

**Высокія тэмпературы.** Апошнім часам зімы бываюць даволі мяккія і цёплыя. Пры такім надвор'і вечназялёныя расліны пакутуюць ад выпарвання. На пашкоджаных парастках могуць з'явіцца грыбкі. Вырашыць праблему можна бліжэй да вясны: хворыя галінкі трэба будзе выдаліць, а саму расліну апрацаваць фунгіцыдам.

Калі вы хочаце штучна запаволіць рост туі або ядлоўца альбо павялічыць іх галінаванне, спатрэбіцца абрэзка. Істотны плюс такога мерапрыемства — паляпшэнне цыркуляцыі паветра ў кроне вечназялёнай расліны.

### *Дзеянні з надыходам вясны*

Калі час павернецца на вясну, трэба будзе ўважліва агледзець хвойныя расліны, каб зразумець, ці ўдала прайшла для іх зімоўка. Усе пашкоджаныя, траўмаваныя галінкі абавязкова выдаліць. Расколіны замажце садовым варам.

Нельга абысці ўвагай і такую важную дэталь, як вясновая падкормка. Гэта трэба зрабіць пасля таго, як снег растане і адновіцца вегетацыя. Выбірайце грануляваныя мінеральныя ўгнаенні. Уносіцца яны проста: гранулы рассыпаюць вакол каранёў, а потым закопваюць у глебу.

Не забудзьцеся пра мульчыраванне хвойных. Гэта важны крок: задача пласта мульчы — затрымліваць рост пустазелля і абарона глебы ад эрозіі.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.12 | 16.49 | 7.37 |
| Віцебск — | 9.09 | 16.31 | 7.22 |
| Магілёў — | 9.02 | 16.39 | 7.37 |
| Гомель — | 8.50 | 16.44 | 7.54 |
| Гродна — | 9.26 | 17.06 | 7.40 |
| Брэст — | 9.18 | 17.14 | 7.56 |

### Месяц

*Поўня 3 снежня.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Аляксея, Барыса, Макара, Мітрафана, Рыгора, Фёдара.*
**К.** *Леанціны, Емяльяна, Здзіслава, Зянона, Мікалая.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## ■ На слыху

## СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ, ЕЎРОПУ ЗДЗІВІЦЬ

### Стартаваў беларускі нацыянальны адбор на конкурс «Еўрабачанне-2018»

**У мінулыя выхадныя Белтэлерадыёкампанія абвясціла аб пачатку прыёму заявак ад ахвотнікаў прадставіць нашу краіну на міжнародным песенным конкурсе «Еўрабачанне», што пройдзе ў Партугаліі 8—12 мая наступнага года.**




**Каму перададуць эстафету сёлетнія беларускія ўдзельнікі з NAVIBAND?**

Традыцыйна заяўкі ад удзельнікаў нацыянальнага адбору прымаюцца ў выглядзе каштоўных бандэроляў на адрас: 220807, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9 з паметкай «Нацыянальны адборачны тур конкурсу песні «Еўрабачанне-2018». Апошні дзень прыёму заявак — 26 снежня (па паштовым штэмпелі).

Праслухоўванне кандыдатаў, адзначаюць у медыяхолдынгу, пройдзе ў тэрмін да 14 студзеня і будзе адкрытым — сачыць за ім можна будзе падчас анлайн-трансляцыі на сайце www.tvr.by. Прафесійнае журы вызначыць максімум 15 выканаўцаў і калектываў, якія выступяць у фінале адбору. А фінальны этап, зноў жа традыцыйна, адбудзецца ў выглядзе тэлевізійнага гала-канцэрта не пазней за 1 сакавіка. Пераможцу выберуць сумесна гледачы і журы па схеме 50/50.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 6 СНЕЖНЯ

**1492** год — Хрыстафор Калумб адкрыў в. Гаіці і назваў яго Эспаньёлай.



**1520** год — нарадзілася Барбара Радзівіл, каралева польская і вялікая княгіня літоўская. Была другой жонкай Жыгімонта II Аўгуста. Атрымала выдатную дамашнюю адукацыю: ведала некалькі замежных моў, займалася гісторыяй, літаратурай, маляваннем, музыкай, танцамі, верхавой яздой. Памерла ў 1551 г., праз паўгода пасля сваёй каранацыі. Пахавана ў Віленскім кафедральным касцёле. Барбара Радзівіл стала гераіняй многіх легендаў, у якіх выступае ў вобразе Чорнай панны, а гісторыі рамантычнага кахання Барбары і Жыгімонта прысвечаны шматлікія мастацкія творы.

**1742** год — нарадзіўся Андрэй Казіміравіч Меер, беларускі краязнаўца, этнограф, гісторык 2-й паловы XVIII ст. Укладальнік «Батанічнага слоўніка». Аўтар працы «Апісанне крычаўскага графства або былога староства», у якой побач з характарыстыкай прыродна-геаграфічных умоў, стану сельскай гаспадаркі і мануфактурных прадпрыемстваў, складу насельніцтва па этнічных і канфесійных прыкметах апісаў народны побыт і культуру беларусаў, змясціў некалькі беларускіх фальклорных твораў. Памёр у 1807 годзе.

**1933** год — нарадзілася (г. Орша) Зінаіда Якаўлеўна Мажэйка, беларускі этнамузыколаг, доктар мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Асноўныя даследаванні па тыпалогіі і меласе абрадавага фальклору, экалогіі руральнай (гісторыка-стылёвай) культуры, гісторыі этнамузыказнаўства. Арганізавала выпуск грамплацінак, у іх ліку музычны фальклор Беларуса кага Палесся з серыі «Музычны фальклор народаў свету» (Гран-пры ЮНЕСКА, 1988). Паводле яе сцэнарыю знята сем дакументальных музычна-этнаграфічных фільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1938** год — на першым з'ездзе мастакоў БССР заснаваны Саюз мастакоў Беларусі (з 1992 года — Беларускі саюз мастакоў).

**1957** год — нарадзіўся Міхаіл Сяргеевіч Еўдакімаў, савецкі і расійскі гумарыст, парадыст, акцёр, спявак і тэлевядучы; чацвёрты губернатар Алтайскага краю. Заслужаны артыст Расіі. Загінуў у аўтакатастрофе ў 2005 годзе.

Было сказана

**Мікола АРОЧКА, паэт:**
«Не хачу між калоссяў
Быць коласам тым,
Што часамі ўзрастае без зерня».

## УСМІХНЕМСЯ

**Дарагая рэдакцыя! Дзякуй вам за рэцэпт.**

**Авакада мы замянілі адварной бульбай, а крэветкі — падсмажаным салам, але ў цэлым ваш рэцэпт салаты з авакада і крэветкамі нам вельмі спадабаўся.**

— Фімачка, дарагая, а дыялог яшчэ магчымы ці ты ўжо адназначна маеш рацыю?..

**Для мужчыны парадак — гэта калі ён паклаў рэч, і яна ціха ляжыць на сваім месцы.**

**А вось калі рэч перамяшчаецца — гэта ўжо непарадак.**

Як на самай справе складаюцца гараскопы:

— Ты хто па гараскопе?

— Скарпіён.

— Так і запішам. На наступным тыдні Скарпіёны павінны аддаць даўгі, інакш іх чакаюць вялікія непрыемнасці.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4650.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 снежня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
6 снежня 2017 г. №46 (430)



стар. 5

Сярэбраны звон над Цімкавічамі



стар. 6

У глыбінку — па «карцінкі»



стар. 7

Кіраваць домам эфектыўна

ТЭМА ТЫДНЯ

# СПАДЧЫНА. ПЕРЫЯД РЭНЕСАНСУ

У Гродзенскай вобласці вядзецца татальная рэканструкцыя гістарычных помнікаў



Палац Друцкіх–Любецкіх у Шчучыне — зараз цэнтр творчасці моладзі і дзяцей.

**РАБОТЫ ідуць паўсюдна. Самыя знакамітыя аб'екты рэгіёна ператварыліся ў будаўнічыя пляцоўкі. Каб да канца года паспець засвоіць выдаткаваныя сродкі, работы актывізавалі. Ход рэканструкцыі пастаянна кантралюецца кіраўніцтвам вобласці.**

## Новае аблічча Каложы

У гэтым годзе, нарэшце, пачаліся сур'ёзныя работы на самых знакавых аб'ектах — Каложы і Старым замку ў Гродне. Старажытныя гісторыка-культурныя помнікі набудуць не толькі новае аблічча, але і трывалы падмурак. На капітальны рамонт Каложскай (Барысаглебскай) царквы XII стагоддзя з фонду Прэзідэнта выдзелена 200 тысяч рублёў. Сродкі пайшлі на рамонт драўлянай часткі храма, якая апошні раз узнаўлялася гадоў сто таму. Як вядома, у сярэдзіне XIX стагоддзя амаль палова царквы была разбурана моцнай паводкай Нёмана, на схіле якога і знаходзіцца старажытная святыня.

Зараз былую драўляную сцяну цалкам замянілі. Каркас узмацнілі, апрацавалі супраць узгарання і распачалі мантаж абшыўкі з тэрмамадыфікаванай хвоі. Будаўнікі абяцаюць, што новае «адзенне» Каложы праслужыць доўга, бо дрэва не баіцца ні вільгаці, ні сонечных промняў, ні маразоў.

стар. 4

ШТО МОЖА ДЭПУТАТ

# АКТЫВІСТ РАЁННАГА МАШТАБУ

Карэспандэнт «МС» высвятляла, што па сіле звычайнаму народнаму абранніку з глыбінкі

**Пятнаццаць гадоў таму ў аграгарадок Радамля Чавускага раёна прыехала па размеркаванні маладая сям'я настаўнікаў — Андрэй і Алена Рагуевы — і засталася. Галава сямейства, акрамя таго, што выкладаў у школе геаграфію, у хуткім часе стаў актыўна займацца грамадскай дзейнасцю ўжо як дэпутат. Лічыць, што гэта яго прызванне. Бо нават без дэпутацкага статусу заўсёды імкнуўся дапамагаць іншым. Зараз ён дэпутат адначасова сельскага і раённага Саветаў. «І на трэці тэрмін гатовы ісці, — прызнаецца. — Мне падабаецца працаваць з людзьмі, быць у курсе іх спраў. А калі атрымліваецца вырашыць чыюсьці праблему, наогул адчуваю сябе шчаслівым. Значыць, не дарэмна стараўся».**

## Як прыватнае становіцца агульным

Радамля не заўсёды была невялікім населеным пунктам. У X—XI стагоддзях яна наогул з'яўлялася сталіцай радзімічаў, археолагі знайшлі тут шмат пацвярджэнняў гэтаму. Менавіта з Радамлі пачалося засяленне плямёнамі міжрэчча Сожа і Дняпра. Зараз тут нават фестываль праводзіцца пад назвай «У госці да радзімічаў». Сёлета ён сабраў гасцей ужо чацвёрты раз. На жаль, жыхароў у аграгарадку не вельмі шмат — крыху больш за 300. Школа, дзе працуе Андрэй Рагуеў, невялікая: усяго 50 вучняў і 20 выхаванцаў дзіцячага садка. Але апошнім часам нараджальнасць павысілася, і педагогі спадзяюцца, што колькасць навучэнцаў будзе толькі расці.

— Налета можа назбірацца 25 чалавек у дзіцячым садку, — радуецца дэпутат. — Гэта цуд, улічваючы, што прадпрыемстваў у нас няма, а калгасы таксама не вельмі квітнеюць.

Школа ў аграгарадку — асноўны духоўны і адукацыйны цэнтр. Тут дзяцей вучаць быць разважлівымі і цікаўнымі, пад кіраўніцтвам настаўнікаў яны ездзяць на экскурсіі і ўдзельнічаюць у конкурсах і алімпіядах. Андрэй Рагуеў падлічыў, што толькі па яго прадмеце за апошнія сем гадоў атрымана 13 дыпломаў. У школе не забываюць сваіх папярэднікаў, збіраюць гістарычныя факты. Налета ўстанове спаўняецца 135 гадоў, сярод яе выпускнікоў шмат вядомых асоб. Напрыклад, драматург Канстанцін Губарэвіч, па творы якога зняты ўсім вядомы фільм «Дзяўчынка шукае бацьку». А яшчэ Губарэвіч быў першы, хто расказаў праўду пра Брэсцкую крэпасць.

стар. 3



Андрэй РАГУЕЎ
адначасова дэпутат сельскага і раённага Саветаў.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ТРЫ ВЫМЯРЭННІ НА СЛУЖБЕ ЭКАНОМІК

### *Міхаіл Мясніковіч правёў сустрэчу з сербскім калегам*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ сустрэўся з віцэ-спікерам Парламента Сербіі Вералюбам АРСІЧАМ, які прыбыў у Мінск для ўдзелу ў пасяджэнні Парламенцкай асамблеі парламенцкага вымярэння Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы (ЦЕІ).**



Падчас перагавораў разгледжаны перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва. Спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыў, што Беларусь і Сербія эфектыўна ўзаемадзейнічаюць у палітычнай і эканамічнай сферах, паспяхова развіваюць парламенцкія сувязі. «Мы бачым падтрымку з боку парламентарыяў Сербіі пры абмеркаванні адчувальных для Беларусі пытанняў», — сказаў ён.

Умацаванню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва спрыяе рэалізацыя дзвюма дзяржавамі дарожнай карты на 2017—2018 гады. «Усе тры вымярэнні — парламенцкае, бізнес-супольнасць, урадавыя колы — працуюць у цесным кантакце, і, безумоўна, гэта ў інтарэсах нашых эканомік», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі. У сваю чаргу Вералюб Арсіч падзякаваў за цёплы прыём і выказаў упэўненасць у далейшым пашырэнні партнёрства паміж краінамі.

## КАБ РУХАЦЦА НАПЕРАД

### *Уладзімір Панцюхоў узяў удзел у семінары*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, член Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі (ПС) па эканамічных пытаннях Уладзімір ПАНЦЮХОЎ прыняў удзел у пасяджэнні пастаянна дзеючага пры ПС семінара па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Яго асноўная тэма — «Фарміраванне адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы: праблемы, перспектывы, інавацыі».**

Удзельнікі семінара разгледзелі пытанні развіцця прававых асноў фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы і асноўныя інструменты рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, формы і механізмы развіцця інавацыйнай інфраструктуры ў Беларусі і Расіі, а таксама кірункі супрацоўніцтва ў галіне камерцыялізацыі вынікаў навуковых даследаванняў і трансферу тэхналогій, замежны вопыт рэалізацыі інавацыйных прарываў. Па выніках семінара распрацаваны дакумент з практычнымі рэкамендацыямі, які будзе накіраваны зацікаўленым.

У мерапрыемстве, акрамя дэпутатаў ПС, прынялі ўдзел парламентарыі дзвюх дзяржаў, прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, профільных міністэрстваў і ведамстваў Беларусі і Расіі, кіраўнікі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, вядучых даследчых інстытутаў і ВНУ.

## АД ДАРОГ ДА МЯСЦОВАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ

### *Сенатар правёў прамую тэлефонную лінію*

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіл СІЦЬКО правёў прамую тэлефонную лінію з жыхарамі Ваўкавыскага, Мастоўскага і Шчучынскага раёнаў.**

Звароты датычыліся добраўпарадкавання двliving-free... 

Звароты датычыліся добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, асвятлення вуліц і дарог, асфальтавання ўчастка дарогі паміж населенымі пунктамі, а таксама атрымання жыллёвых субсідый, якасці аказання камунальных паслуг, зносу старых будынкаў, работы банкаматаў у сельскай мясцовасці, магчымасці аднаўлення работы мясцовага тэлебачання.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

# САКРЭТ ІНАВАЦЫЙ — У КАДРАХ

**Ад таго, якіх спецыялістаў падрыхтуюць у ВНУ, залежыць узровень працы маладых кадраў у навуцы, на прадпрыемствах і ў вытворчасцях. Менавіта гэтую тэму абмеркавалі падчас пашыранага пасяджэння прэзідыума навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі.**

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, спікер верхняй палаты беларускага парламента,** нагадаў пра задачы, якія былі пастаўлены кіраўніком дзяржавы на сёлетнім Рэспубліканскім педагагічным савеце. Адна з іх — удасканаленне шматступеннай прафесійнай падрыхтоўкі кадраў. «Зразумела, што эканоміка наша інавацыйная, таму яна патрабуе і высокакваліфікаваных кадраў», — лічыць спікер верхняй палаты парламента. А гэта тыя спецыялісты, якія будуць займацца пытаннямі развіцця, а менавіта распрацоўкі і вытворчасці тавараў, тэхнічнага забеспячэння, кіравання вытворчасцю, яе ўдасканаленнем і мадэрнізацыяй.

Другая тэма — аптымізацыя пераліку спецыяльнасцяў ва ўніверсітэтах і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Трэцяя — удасканаленне падыходаў да прагнозаў патрэбы ў падрыхтоўцы кадраў. Варта таксама працаваць над павышэннем канкурэнтаздольнасці вядучых універсітэтаў, развіваць экспарт адукацыйных паслуг і ўзмацняць практычную падрыхтоўку спецыялістаў.

Змены ў сістэме адукацыі без заканадаўчых рашэнняў уявіць немагчыма. Па словах **рэктара Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (РІВШ) Віктара ГАЙСЁНКА,** змяненні ў Кодэкс Беларусі аб адукацыі падрыхтаваны і ў хуткім часе будуць унесены ва ўрад. Згодна з папраўкамі, пэўным чынам зменіцца структура вышэйшай адукацыі. Акрамя таго, плануецца значна скараціць колькасць спецыяльнасцяў. У сувязі з гэтым прапануецца ўвесці ўзбуйненыя спецыяльнасці, а спецыялізацыі з класіфікатара спецыяльнасцяў наогул зняць. У праекце кодэкса ўводзіцца і новая класіфікацыя ВНУ, будзе праведзена іх ранжыраванне па пэўных паказчыках.

Папраўкі ў Кодэкс аб адукацыі павінны стаць галоўнай тэмай адкрытых парламенцкіх слуханняў у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

* * *

# КРЫНІЦЫ РОСТУ ДЛЯ ФОНДАВАГА РЫНКУ

**У пасяджэнні секцыі навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі прынялі ўдзел члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі Нацыянальнага банка, Міністэрства фінансаў, Міністэрства эканомікі, іншых дзяржаўных органаў, а таксама дзелавых колаў.**

Як адзначыў **кіраўнік секцыі, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ,** наспела неабходнасць грунтоўна папрацаваць над стратэгіяй развіцця фондавага рынку — з улікам новых рэалій і міжнароднага вопыту. Па словах старшыні Пастаяннай камісіі, галоўная функцыя фондавага рынку — хутка і адэкватна рэагаваць на зменлівую эканамічную і сацыяльна-палітычную сітуацыю ў краіне і свеце.

**Першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Тарас НАДОЛЬНЫ** адзначыў, што ключавыя праблемы, з якімі сёння сутыкаецца фондавы рынак — нездавальняючы стан некаторых прадпрыемстваў, высокая доля адміністравання дзяржавай, не заўжды вялікі інтарэс інвестараў. Сярод прапаноў для паляпшэння Тарас Надольны агучыў такія, як стварэнне інвестыцыйнага банкінгу, замяшчэнне механізмаў дзяржаўнай падтрымкі на рынкавыя інструменты, удасканаленне карпарацыйнага кіравання, развіццё інстытутаў калектыўных інвестыцый. Але гэта, па яго словах, толькі «цюнінг», які варта рабіць пасля вырашэння ключавых пытанняў.

Па словах **дырэктара Дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў Сяргея СУШКО,** сучаснае беларускае заканадаўства дазваляе выкарыстоўваць такія інструменты рынку каштоўных папер, як акцыі, аблігацыі, вэксалі, закладныя. Гэты сегмент фінансавага рынку прадстаўляюць больш чым 4,5 тысячы ўдзельнікаў. У краіне зарэгістравана 4568 акцыянерных таварыстваў, у тым ліку адкрытых — 2401 і закрытых — 2167. Больш за 90% выпушчаных акцый прыпадае на адкрытыя акцыянерныя таварыствы. «Але акцыі сёння не выкарыстоўваюцца ў належнай меры як інструмент прыцягнення прыватных інвестыцый для забеспячэння крыніц мадэрнізацыі і развіцця прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі. Нагрузка на бюджэт не зніжаецца», — паведаміў Сяргей Сушко.

Удзельнікі абмеркавалі ідэі, рэалізацыя якіх паспрые больш эфектыўнай рабоце фондавага рынку. А гэта развіццё інстытута страхавання курсавых рызык і абарона правоў забяспечаных крэдытораў, у тым ліку ўладальнікаў аблігацый. Акрамя таго, была звернута ўвага на важнасць стварэння механізма эксперыментальных пляцовак, якія дазваляюць тэсціраваць новыя прадукты і паслугі ў кантраляваным асяроддзі без рызыкі парушыць заканадаўства.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
pustavit@zviazda.by

ВЫБАРЫ-2018

# СПАКОЙНА І БЕЗ ЭКСЦЭСАЎ

### Праходзіць сёлета выбарчая кампанія

**Сёння дадзены старт серыі рэспубліканскіх семінараў, на якіх будуць абмяркоўвацца пытанні работы тэрытарыяльных камісій, вылучэння кандыдатаў у дэпутаты і рэгістрацыі ініцыятыўных груп. Пра гэта расказала старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА напярэдадні рэспубліканскага семінара-вучобы з кіраўнікамі і арганізатарамі кампаніі па выбарах дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета.**

— Учора, па сутнасці, былі ўтвораны галоўныя выбарчыя камісіі на дадзеных выбарах — акруговыя. Мы знаходзімся напярэдадні самага галоўнага і публічнага этапу выбараў — вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, грамадзяне ўжо прыносяць заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Кампанія ідзе спакойна, скаргаў няма. Ёсць звароты з нагоды тлумачэння заканадаўства.

Усе пытанні на будучых выбарах маюць першараднае значэнне, таму людзі, якія задзейнічаны ў іх арганізацыі, павінны быць падрыхтаваны, упэўнена старшыня Цэнтрвыбаркама.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
lukashevich@zviazda.by

# НЕ АДЫХОДЗЯЧЫ АД ПЛАНА

**Нагадаем аб каляндарным плане, згодна з якім рэалізуецца электаральны працэс. Так, да 24 лістапада былі створаны тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, а да 4 снежня — акруговыя. Далей, да 16 снежня, будуць арганізаваны ўчасткі для галасавання, а да 3 студзеня — участковыя выбарчыя камісіі.**

У Гродзенскай вобласці ўтворана 60 акруговых камісій па выбарах у Гродзенскі абласны Савет дэпутатаў, у складзе кожнай — 11 чалавек. Як паведамляе БЕЛТА, 2 снежня прайшло сумеснае пасяджэнне прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў і Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

— У склад камісій былі абраныя тыя, хто зможа правесці выбарчую кампанію кампетэнтна і арганізавана, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама Валерый КЛІМОВІЧ.**

Розныя арганізацыі праяўляюць немалую цікавасць да выбараў — дастаткова сказаць, што ў акруговыя камісіі ўвайшлі прадстаўнікі камуністаў, «Белай Русі», «БРСМ», Беларускага саюза жанчын, Беларускага фонду міру і многіх іншых.

Склад 60 акруговых камісій зацверджаны і ў Віцебску.

— Найбольшую актыўнасць тут праявілі грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі — больш за 60% ад агульнай колькасці заяў. Заявы ад працоўных калектываў складаюць 9,9%. Шляхам збору подпісаў грамадзян пададзена 29,5% заяў, — расказаў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Што датычыцца Брэста, то прэзідыумы Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта на сумесным пасяджэнні таксама зацвердзілі склады акруговых выбарчых камісій. Цікавы факт — само мерапрыемства адбылося ў фармаце відэаканферэнцыі. Тут выбары пройдуць у 57 акругах. У складзе акруговых камісій — 759 прадстаўнікоў, з іх 99 вылучана працоўнымі калектывамі, 227 — грамадзянамі шляхам падачы заяў, 46 — палітычнымі партыямі, а 387 — грамадскімі аб'яднаннямі.

Што да беларускай сталіцы, то тут створана дзевяць раённых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, якія і ажыццяўляюць паўнамоцтвы акруговых. У кожнай — па 13 чалавек, усяго ж налічваецца 117 членаў, тады як вылучалася 187 прадстаўнікоў. Дарэчы, у акруговых выбаркамах Мінска прадстаўнікі палітычных партый і аб'яднанняў склалі высокія 86,3%.

# АКТЫВІСТ РАЁННАГА МАШТАБУ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Для Андрэя Рагуева вельмі важна, каб нікога з гэтых людзей не забылі. Таму збірае звесткі пра іх і ахвотна дзеліцца інфармацыяй з аўтарамі пазнавальных кінапраграм — «Падарожжа дылетанта», «Гісторыя з геаграфіяй», «Усё пуцём». Лічыць, што менавіта з любві да месца, дзе ты жывеш, і да жыхароў гэтага населенага пункта ўсё і пачынаецца. Тут няма прыватных праблем — усе агульныя, а значыць усё, што ты робіш для іншых, робіш для сябе. Сам дэпутат родам з Крычаўскага раёна, але палюбіў новае месца жыхарства так, што лепшага сабе не ўяўляе. Таму робіць усё, што ад яго залежыць, каб аграгарадок квітнеў.

— Дзяржава вызначылася, што аграгарадкі павінны стаць пунктамі росту, а значыць, у нас павінна быць уся інфраструктура, нават калі гэта стратна, — разважае ён. — У нас ёсць усё неабходнае для жыцця — школа, дзіцячы сад, пошта, крама, банк. І трэба, каб усё гэта і далей функцыянавала. Без школы і іншых аб'ектаў населены пункт доўга не пратрымаецца. Я вунь нават агітаваў людзей, каб газеты выпісвалі менавіта ў Радамлі, каб за паслугі плацілі ў нашым мясцовым аддзяленні банка. Дарэчы, сам я заўсёды выпісваю «Звязду», чытаю яе ад коркі да коркі, бо мне яна вельмі падабаецца.

## Выпрабаванне буднямі

Андрэй Рагуеў адразу ж папярэджвае, што ўсе тыя справы, якія прыходзілася вырашаць — гэта заслуга не толькі яго, а ўсіх зацікаўленых асоб: у першаю чаргу сельсавета і Чавускага райсавета, бо як толькі нехта звяртаецца па дапамогу, дэпутат адразу ж даносіць гэты сігнал да старшыні сельскага Савета. Калі на мясцовым узроўні нельга вырашыць пытанне, выходзяць на раённы. А калі там палічаць патрэбным, то і на абласны. Як гэта было з падключэннем некалькіх двухпавярховікаў да цэнтралізаванага ацяплення.

— У пачатку 90-х яны ацяпляліся ад калгаса, але калгас абанкруціўся і ацяпленне адключылі. А людзям дапамаглі зрабіць грубкі ў кватэрах, і чвэрць стагоддзя яны з імі жылі. Сучасныя кватэры з ваннамі, каналізацыяй, з вялікімі пярэднімі пакоямі і... грубкамі, уяўляеце? — расказвае дэпутат. — Людзі спачатку прызвычайваліся, а некалькі гадоў таму пачалі скардзіцца, прасіць аднавіць цэнтралізаванае ацяпленне. Праблему вырашалі ўсёй грамадой — сельскі Савет, райсавет і нават аблвыканкам. Садзейнічаў і дэпутат парламента Аляксандр Разганаў. Размова ішла пра мільярды рублёў у старых грашах. У выніку дом трапіў у план па рэканструкцыі, і два гады таму туды вярнулася цэнтралізаванае ацяпленне.


У школьным музеі ёсць рэдкія экспанаты, частка якіх з'явілася тут дзякуючы Андрэю РАГУЕВУ.

— І людзям добра, і камунальнікі нашы нічога не страцілі, — радуецца дэпутат. — Раней ацяпляліся толькі школа і Дом культуры, а цяпер яшчэ і 50 кватэр.

Летась жыхары прыйшлі да дэпутата з прэтэнзіямі да якасці сувязі. Да інтэрнэту была праблема падключыцца.

— Радамлю ўнослілі ў планы Белтэлекама на пракладку оптавалаконных сетак, але ў аддаленыя, — дзеліцца дэпутат. — Я з'ездзіў на гэта прадпрыемства ў Чавусы і пагутарыў з адказнымі асобамі. Там спыталі, колькі чалавек жадае карыстацца такімі паслугамі? Маўляў, калі адзін-два, ім гэта не цікава. Я вярнуўся і сабраў больш за сотню подпісаў. Пасля гэтага нам правялі высокахуткасны інтэрнэт.

Яшчэ прыклад. Ад Чавусаў да Радамлі зараз ідзе добрая дарога. Аказваецца, за яе некалькі гадоў змагаліся дэпутаты, у тым ліку і Андрэй Рагуеў.

— Гэта была адзіная ў раёне дарога без асфальту, — кажа ён. — Калі ў 2006 годзе ў нас зрабілі аграгарадок, справы пачалі рухацца. Але ў 2010-м усё прыпынілася. Заставалася ўсяго пяць кіламетраў гравійкі, але што ні рабілі, усё ўпіралася ў недахоп сродкаў. За час вырашэння праблемы пазнаёміўся з супрацоўнікамі Магілёўаблдарбуда. Наведваў іх практычна пастаянна. Сельскі і раённы Саветы вырашалі пытанне на сваіх узроўнях. У рэшце рэшт нас пачулі, уключылі ў абласную праграму, і грошы на дарогу знайшліся. Цяпер мы з асфальтам. Але цераз Радамлю ідзе прамая дарога з Чавус на Дрыбін і Горкі. Застаўся 4-кіламетровы ўчастак ад аграгарадка да вёскі Заложжа, дзе няма асфальту і ў сезон дажджоў цяжка праехаць. Жыхары неаднаразова звярталіся з просьбай пакласці на гэтым адрэзку асфальт. Пытанне знаходзіцца на кантролі і ў сельвыканкаме, і ў раёне. І я не забываў наведвацца ў той жа Магілёўаблдарбуд, пацікавіцца, як можна вырашыць наша пытанне. Нарэшце сумеснымі намаганнямі атрымалася дабіцца, каб нас уключылі ў план рамонту мясцовых дарог на 2017—2020 гады.

Раней жыхары не толькі глабальныя пытанні ўзнімалі, але і па кожнай драбязе беглі да дэпутата. Ён цярпліва тлумачыў, што для вырашэння праблем накшталт «лямпачка перагарэла» або «батарэі слаба грэюць» ёсць адпаведныя службы і яны з гэтым справяцца хутчэй. А вось калі там не паслухалі, дэпутат гатовы данесці інфармацыю да старшыні сельскага або раённага Савета. Ёсць катэгорыя людзей, якія цікавяцца, калі ім сена прывязуць або трактар прыедзе агароды араць. Гэтыя пытанні таксама можна самастойна высветліць. Ды і старасты ёсць. Што датычыцца невырашальных пакуль праблем, тут трэба растлумачыць, што прыйдзецца пачакаць.

— Некалькі чалавек хвалявала, якія перспектывы па газіфікацыі аграгарадка, — прыводзіць прыклад Андрэй Уладзіміравіч. — Мы, на жаль, далёка ад Чавусаў, газаправода побач няма. І я паслаў дэпутацкі зварот кіраўніцтву аблгаза з пытаннем, ці плануецца ў найбліжэйшую пяцігодку газіфікацыя аграгарадка. Адказалі, што не. І мы ўжо людзей дарма не абнадзейваем. Кажам, што будзе другая пяцігодка, магчыма, планы зменяцца.

## Не дзеля льгот

— А калі б вы не былі дэпутатам, нешта рабілі б проста так? — пытаюся ў Андрэя Рагуева.

— Дэпутацкая пасада ўсё ж абараняе. Калі б я хадзіў проста так па грамадскіх пытаннях, мяне, напэўна, запісалі б у скаржнікі *(усміхаецца)*. І цяпер часам смяюцца, маўляў, калі мяне паслухаць, у наш бок і аўтобусы не ходзяць, і асфальту ў нас няма. Аўтобусы, сапраўды, нячаста ходзяць, але сацыяльны стандарт выконваецца. Аўтапарк — не такая багатая арганізацыя, якая магла б браць на сябе выдаткі. Ды і не так шмат у нас людзей карыстаецца грамадскім транспартам. Яшчэ 15 гадоў таму набіваўся цэлы аўтобус народу, па маршруце было шмат «жывых» вёсак. А цяпер вольных месцаў у салоне хапае, таму праcіць лішні рэйс неяк не выпадае.

— А ездзіць у раён, тэлефанаваць па дэпутацкіх справах даводзіцца за свой кошт?

— А куды ж падзецца? Часам толькі па мабільным за месяц па праблемах выбаршчыкаў на чатыры рубліназвоньваю, але я ніколі не скарджуся на гэтыя выдаткі, а паездкі ў раён ці вобласць стараюся сумяшчаць са сваімі справамі. Вырашыў свае пытанні — пайшоў па грамадскіх.

Андрэй Рагуеў наогул чалавек актыўны. З'яўляецца членам грамадскай арганізацыі «Белая Русь». Адказна ставіцца да грамадскіх даручэнняў. Калі быў давераны асобай Аляксандра Лукашэнкі падчас выбараў Прэзідэнта, абышоў амаль кожны дом. Заадно меў магчымасць пагутарыць з жыхарамі аб праблемах. Калі адбываліся выбары ў парламент, збіраў подпісы за Анатоля Хішчанку. Узніклі пытанні па Дэкрэце №3 — ніколі не адмаўляўся прысутнічаць на прыёме грамадзян.

— І жонка мая такая ж. Падтрымлівае мяне ва ўсім.



У мясцовай школе ганарацца сваімі папярэднікамі.

— А ніколі не было крыўды на тое, што вы стараецеся, свае грошы і час трáціце, а ў дэпутатаў нават ільгот няма?

— Прыходзіцца, вядома, і на паліва траціцца, і на тэлефон. Але думкі, што ўсё гэта ўпустую, ніколі не ўзнікала. І нават намеру адмовіцца ад дэпутацтва толькі таму, што лішні раз па грамадскіх справах кудысьці з'ездзіў ці зайшоў, не было. Калі дэпутат хоча працаваць, нешта рабіць, ён, незалежна ад таго, ёсць у яго льготы або не, будзе займацца гэтым пытаннем. Дарэчы, некаторыя выбаршчыкі да гэтага часу думаюць, што нам плацяць. Адзін чалавек наадрэз адмовіўся верыць, што я хаджу па грамадскіх справах бясплатна. Пераконваць такіх бессэнсоўна. Ды я і не збіраюся. Падчас апошніх выбараў мяне падтрымалі 94% выбаршчыкаў. Гэта вялікі давер. І для мяне гэта вельмі важна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Старшыня Радамлянскага сельскага Савета дэпутатаў Валерый ЯФІМЕНКА:**

— На тэрыторыі нашага сельсавета — 28 населеных пунктаў, дзе пражывае больш за тысячу жыхароў. Штогод па кожным населеным пункце распрацоўваем план па сацыяльна-эканамічным развіцці, які трэба яшчэ абараніць на ўзроўні раёна, даказаць, што гэта патрабаванні жыццёва неабходнай важнасці. Грошы на іх рэалізацыю неабходны немаленькія, на ўсё іх не хапае. Таму звяртаемся да насельніцтва з заклікам прыняць удзел у добраўпарадкаванні. Ахвотныя дапамагчы могуць напісаць заяву і ахвяраваць сродкі. Сёлета з удзелам грамадзян добраўпарадкавалі могілкі ў Русінаўцы і Пухнаве. Праводзім Дні Савета, дзе не толькі абмяркоўваем праблемы жыхароў, але і тлумачым, як можна паскорыць іх рашэнне. Людзі ставяцца да гэтага з паразуменнем і па меры сіл дапамагаюць рабіць свой населены пункт лепшым.

НОУ-ХАУ

# ОФІСНАЯ ПАПЕРА З МАКУЛАТУРЫ ЎЖО Ў БЕЛАРУСІ

## Засталося толькі наладзіць збор сыравіны для яе

**Барысаўскае прадпрыемства «Папяровая фабрыка» Дзяржзнака пачало вырабляць офісную паперу з макулатуры. Раней у Беларусі гэтым ніхто не займаўся. Эксперты сцвярджаюць, што такая ініцыятыва дапаможа скараціць расход вады і электраэнергіі, захаваць лясныя рэсурсы і наладзіць сістэму збору другаснай сыравіны.**

Тэхніка для вырабу высакаякаснай офіснай паперы ў прадпрыемства з'явілася дзякуючы праекту «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца ў межах Праграмы развіцця ААН у партнёрстве з Мінпрыроды Беларусі.

— Еўрасаюз выдзеліў 12 мільёнаў еўра для пераходу да мадэлі «зялёнай» эканомікі ў Беларусі. Мы рэалізавалі 23 пілотныя ініцыятывы. Выраб офіснай паперы з макулатуры — самая буйная з іх, — расказала **кіраўнік прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН.** — Гэты праект паказвае, наколькі эфектыўна працуюць «зялёныя» тэхналогіі з экалагічнага і эканамічнага пунктаў гледжання, і як яны мяняюць спажывецкія звычкі.

На рэалізацыю пілотнай ініцыятывы «Папяровай фабрыкі» Дзяржзнака ЕС выдзеліў 860 тыс. еўра. На гэтыя грошы прадпрыемства купіла італьянскае абсталяванне, пабудавала вытворчы ўчастак для сартавання макулатуры, а таксама ўкамплектавала цяперашнюю лінію перапрацоўкі новымі вузламі і механізмамі. Новая тэхніка дазваляе вырабляць якасную офісную паперу з макулатуры ніжэйшай якасці.

Па словах спецыялістаў, усе гэтыя навеўвядзенні дапамогуць знізіць расход вады, паменшыць колькасць узважаных часціц у сцёкавай вадзе і сэканоміць да 50 тыс. кубаметраў паліва ў год.

— Яшчэ два гады таму мала хто ўяўляў, што такое «зялёная» эканоміка і як яна працуе. Сёння мы ўжо бачым канкрэтныя прыклады ўжывання «зялёных» тэхналогій. Гэты маштабны праект паказаў беларусам, як можна зарабляць на экалагічна чыстай вытворчасці. Канкрэтна гэтую ініцыятыву я лічу жамчужынай «зялёнай» эканомікі, — пракаментавала **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА.**

Таксама Ія Малкіна адзначыла, што парад «зялёных» ініцыятыў у Беларусі не спыніцца. Ужо рэалізуецца новы праект «Зялёныя» гарады», праводзіцца работа з агульнаадукацыйнымі ўстановамі і летнімі лагерамі. І ў планах яшчэ адзін буйнабюджэтны экалагічны праект.

**Кацярына КІРЭЕВА.** *katyakireeva@zviazda.by*

# СПАДЧЫНА. ПЕРЫЯД РЭНЕСАНСУ

**Дакладна:** на тэрыторыі Гродзенскай вобласці 691 аб'ект занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны, з іх 335 помнікаў архітэктуры. Сёлета, па рашэнні ўрада Беларусі, у гэты спіс унесена яшчэ 35 помнікаў архітэктуры — касцёлаў, цэркваў, фамільных пахаванняў, будынкаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Новая абшыўка займее глыбокі карычневы колер — з-за двайнога пакрыцця спецыяльнымі масламі. У хуткім часе 180 кв. м плошчы будуць выглядаць па-новаму і больш гарманіраваць з існуючай каменнай часткай, якая захавалася з моманту будаўніцтва царквы. Гродзенцам не церпіцца ўбачыць Каложу абноўленай. Многія падыходзяць, цікавяцца. Будаўнікі запэўнілі кіраўніцтва вобласці, што ўсе работы завершаць у тэрмін. Новае аблічча царква атрымае ў канцы гэтага года.

## Ад спрэчак — да справы

З размахам вядзецца і рэканструкцыя Старога замка. Гэтае месца можна лічыць сэрцам Гродна, бо адсюль і пачаўся сам горад. Размовы аб рэканструкцыі вяліся даўно, але гісторыкі спрачаліся, якой эпосе павінен адпавядаць замак, і нарэшце спыніліся на праекце XVI стагоддзя — часоў караля Стэфана Баторыя. (Дарэчы, у гэтай рэзідэнцыі кароль Рэчы Паспалітай раптоўна памёр.) Пры ім абарончы від замка набыў выгляд палаца.

Сёлета выпучана каля 500 тысяч долараў у эквіваленце з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў на аднаўленне аб'екта. Зараз вядзецца першая чарга рэканструкцыі, якая разлічана да 2020 года. За гэты час будзе ўзведзена галерэя паміж варотамі і замкам, а таксама дабудавана вежа. Падчас другой чаргі адновяць сам палац, трэцяй — сцены і двор.

Аб'ект займае першае месца ў рэестры гісторыка-культурных помнікаў — як па аб'ёме работ, так і па фінансавых затратах. Тут працуюць адразу два найбуйнейшыя будаўнічыя прадпрыемствы рэгіёна. Праект настаянна ўзгадняецца з Міністэрствам культуры. Улады рэгулярна кантралююць графік будаўнічых работ, аб'ёмы і тэрмін засваення сродкаў.

## Піваварня — пад крылом дзяржавы

Бадай, самы пакутлівы аб'ект — комплекс будынкаў былога піваварнага завода. Яны таксама ўваходзяць у рэестр гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь як помнік архітэктуры. Галоўны будынак — гэта былы палац Сапегаў, затым Агінскіх. У другой палове XIX стагоддзя аўстрыйскі купец перабудаваў палац і адкрыў тут піваварню. Гэта традыцыя працягвалася і надалей. Гродзенскі завод варыў піва да 2007 года, пасля з-за неканкурэнтаздольнасці быў закрыты.



У выставачнай зале Лідскага замка.

З гэтага часу пачалася эпапея з яго продажам. Ахвотных набыць аб'ект хапала — вабіла маляўнічая зона на беразе Нёмана. І праекты заяўлялі прывабныя. Адны меркавалі адкрыць бізнес-цэнтр, другія — забаўляльны комплекс, рэстаран і гасцініцу. Праўда, далей праектаў справа не ішла. Былы завод, што называецца, пераходзіў з рук у рукі. Інвестары толькі абяцалі, а ў гэты час будынак на вачах ва ўсяго горада прыходзіў у заняпад. Уласнікаў неадназова штрафавалі за невыкананне ахоўных мерапрыемстваў, але санкцыі ніякіх перамен не прынеслі.

**Год таму гарадскія ўлады паспрабавалі вярнуць аб'ект у дзяржаўную маёмасць, але вяртанне зацягнулася з-за недасканаласці прававой базы. У краіне аналагічных спраў эканамічны суд не разглядаў, паведамілі ў гарвыканкаме. А ў маі гэтага года на тэрыторыі былога завода адбыўся пажар. Над гістарычным аб'ектам навісла рэальная пагроза знішчэння. Да захавання спадчыны падключыліся гарадскія ўлады.**

А нядаўна з Міністэрства культуры атрымалі станоўчы адказ на праект па ўзнаўленні даху, паведамілі ў гарвыканкаме. Вызначаны і тэрміны будаўніцтва — 2,5 месяца.



Стары замак у Гродне.

Брыгада будаўнікоў камунальнай службы Ленінскага раёна Гродна прыступіла да ўзнаўленчых работ, якія вядуцца паскоранымі тэмпамі. Галоўная ўвага ўдзяляецца даху, які будзе мець гістарычны выгляд і нават флюгер. На гэтыя мэты з абласнога бюджэту выдаткавана 150 тысяч рублёў. Аб'ем работы даволі значны, пасля яе былая піваварня набудзе больш рэспектабельны выгляд. Магчыма, дадзены аб'ект будзе прапанаваны інвестарам. Каб выключыць магчымасць даўгабуду, новы ўласнік павінен выконваць ахоўныя абавязак, а таксама правесці рэканструкцыю ў вызначаны тэрмін.

Трэба сказаць, што злосных парушальнікаў становіцца менш. Напрыклад, за мінулы год і сёлета штрафамі пакараны тры інвестары.

## Даспехі, гарматы, партрэты...

Да канца года будзе пастаўлена кропка ў рэканструкцыі паўночна-ўсходняй вежы Лідскага замка. Аб гэтым паведамілі ў аддзеле ідэалогіі Лідскага райвыканкама. Работы вяліся не адзін год, але сёлета тэмпы значна ўзраслі.

З рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў выдаткавана больш за 400 тысяч рублёў. Сродкі накіраваны на будаўніча-мантажныя работы і закупку абсталявання. У вежы будзе разгорнута выставачная экспазіцыя, якая размесціцца на пяці паверхах — на кожным свая тэматыка. Напрыклад, на першым матэрыялы і экспанаты раскажуць аб гісторыі будаўніцтва замка, на другім — аб ваенных дзеяннях каля яго сцен. Будзе і паляўнічая экспазіцыя, і аглядная пляцоўка. Падлічана, што для выстаўкі трэба набыць 32 тысячы экспанатаў — даспехі, гарматы, манекены. Рарытэтныя экспанаты таксама будуць прадстаўлены — яны захоўваюцца ў фондах Лідскага гісторыка-мастацкага музея. Акрамя іншага, будуць заказаны гравюры з выявамі палявання, карта ВКЛ перыяду XVII стагоддзя, партрэты князёў і каралёў.

У наступным годзе рэканструкцыя закране другую вежу. Будуць весціся работы па стварэнні помніка Вялікаму князю ВКЛ Гедзіміну, які быў заснавальнікам замка і Ліды ў XIV стагоддзі. У райвыканкаме паведамілі, што атрымалі 40 заявак ад скульптараў і архітэктараў Беларусі, якія павінны ў хуткім часе прадставіць свае эскізы. Галоўнае патрабаванне — князь павінен быць на кані. Яго ўсталююць у скверы, якраз каля сцяны вежы, якую толькі што адрамантавалі.

Да канца года плануецца завяршыць першы этап работ на Княжацкай вежы Крэўскага замка ў Смаргонскім раёне. Зараз ідзе кансервацыя ўнікальнага помніка сярэднявечча. Вежу і далучаныя да яе часткі сцен расчысціць, а потым умацуюць. Акрамя гэтага, старажытная кладка будзе апрацавана спецыяльным растворам. Сродкі на кансервацыю ў памеры 170 тысяч рублёў выдзелены з прэзідэнцкага фонду па падтрымцы культуры і мастацтва. Мяркуецца і другі этап — кансервацыя Паўночнай сцяны, узвядзенне ўчасткаў на вышыню да сямі метраў і пакрыццё вежы дахоўкай. Архітэктурны праект распрацаваны ў рамках праграмы «Культура Беларусі».



Адрамантаваная вежа Лідскага замка.

## Версаль пад назвай Свяцк

Рэканструкцыя знакамітага палаца пад Гродам ідзе няспынна. Кожны тыдзень тут праходзяць нарады і падбіваюцца каштарысы. Будаўніцтва курыруе намеснік старшыні аблвыканкама. Сёлета аб'ект стаў месцам правядзення суботніка з удзелам кіраўніка рэгіёна Уладзіміра Краўцова, які назваў былы палац жамчужынай Гродзеншчыны.

Кажуць, што гэты палац Джузэпэ Сака праектаваў для шляхецкага роду Валовічаў у адпаведнасці з французскім Версалем. Рысы былой велічы палаца XVIII стагоддзя відаць і сёння. Доўгі час аб'ект пуставаў, а ў 2009 годзе быў перададзены санаторыю «Азёрны». Уласнік напачатку ўклаў сродкі ў рэканструкцыю водных збудаванняў, сажалак, добраўпарадкаванне тэрыторыі. Сёлета пачалася актыўная фаза рэканструкцыі самога палаца. Як расказала **начальнік упраўлення ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Гродзенскага райвыканкама Наталля РАМАНОВІЧ,** задзейнічаны абодва флігелі, дах пакрылі дахоўкай, ідзе замена вокнаў і дзвярэй, вядуцца ўнутраныя работы. Аб значным аб'ёме сведчаць і ўкладзеныя сродкі — за гэты год засвоена 3 млн рублёў.

Гэты аб'ект вельмі важны для рэгіёна, бо знаходзіцца ў бязвізавай зоне побач з Аўгустоўскім каналам, адзначыла Наталля Рамановіч. Пасля рэканструкцыі тут будзе шматфункцыянальны аздараўленчы комплекс з гасцініцай, які можа зацікавіць турыстаў. Таксама мяркуецца праводзіць канферэнцыі, прэзентацыі, канцэрты, выстаўкі, урачыстыя цырымоніі. Такім чынам, некалі занядбаны палац у новым абліччы стане даступны для кожнага.

**Такая тэндэнцыя назіраецца бадай што на ўсіх аб'ектах. Рэканструкцыя не толькі захоўвае гістарычна-культурны помнік, але дае яму другое жыццё. Напрыклад, у аноўленым палацы Агінскіх у Залессі адрадзілі шляхецкія балі, а палац Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне пасля рэканструкцыі адчыніў дзверы для творчай моладзі. Дарэчы, сядзіба Агінскіх хутка стане яшчэ больш прывабнай. Тут плануецца рэстаўрацыя паркавай зоны і ўзнаўленне маляўнічага парку.**

**Сяргей ПІВАВАРЧЫК, загадчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы:**

— У апошні час заўважна актывізаваліся работы па рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Гродне і вобласці. Аднак выклікае занепакоенасць той факт, што шэраг знакавых помнікаў не трапіў яшчэ ў названы працэс. Гэта датычыцца ў першую чаргу будынка былой Медыцынскай акадэміі, ці палаца Чацвярцінскіх у Гродне. Зразумела, што бюджэтных сродкаў на ўсё не хапае. Магчыма, трэба больш актыўна ўцягваць у гэты працэс інвестараў. У Кодэксе аб культуры, прынятым амаль год таму, прапісаны толькі дэкларацыі, звязаныя з аховай гісторыка-культурнай спадчыны, а вось механізмы іх набыцця для інвестараў недакладныя і непрывабныя. Лічу, што ёсць неабходнасць унесці праўкі ці дапаўненні, звязаныя з продажам такіх аб'ектаў, — іх кошт часта вельмі высокі. Магчыма, такі падыход будзе спрыяць развіццю турызму і разгрузіць бюджэт, на які прыпадае даволі значная нагрузка ў захаванні аб'ектаў культурна-гістарычнай спадчыны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
margo@zviazda.by

ІНІЦЫЯТЫВА

# СЯРЭБРАНЫ ЗВОН НАД ЦІМКАВІЧАМІ

## У вёсцы аднавілі гістарычны цэнтр і святыні

**СТАРШЫНЯ Цімкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Капыльскага раёна Алена Вострыкава даўно марыла адрадзіць у вёсцы гістарычны цэнтр. Але для гэтага, вядома, патрабаваліся значныя сродкі. І вось нарэшце мары сталі рэальнасцю.**



Будынак праваслаўнай царквы — прыгожы штрых цімкавіцкага пейзажу.

— Пазалетась мы падавалі заяўку на конкурс мясцовых ініцыятыў, які праводзіцца ў межах міжнароднага праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», — кажа Алена Мечыслаўна. — Але, на жаль, наша заяўка тады не прайшла.

Ды работнікі сельвыканкама не засмуціліся і вырашылі паспрабаваць пайдзельнічаць у конкурсе яшчэ раз. І перамаглі.

Вядома, проста так грошы ніхто не дасць. Каб іх атрымаць, неабходна было дэталёва абгрунтаваць, што прынясе рэалізацыя праекта, для чаго ён неабходны, як будуць развіваць ініцыятыву далей.

— Мы склалі прыблізны бюджэт. Падлікі паказалі, што на ажыццяўленне задуманага патрэбна каля 18 тыс. долараў. Але нам выдзелілі крыху больш за палову ад неабходнай сумы, — адзначае Алена Мечыслаўна.

Да 1830 года ў Цімкавічах існавала Ільінская царква, у 1879-м згадваецца Георгіеўская царква, з 1886 года — царква святцеля Мікалая Цудатворца. Яна была разбурана ў 30-я гады ХХ стагоддзя. Прыход аднавіў дзейнасць у 1999-м. Набажэнствы праходзілі ў адным з памяшканняў пажарнага дэпо. Вядома, такое суседства перашкаджала як пажарнікам, так і вернікам. Затым службу перанеслі ў былы магазін, які не быў для гэтага прыстасаваны... На пасяджэнні сельвыканкама, сходах жыхароў прынялі рашэнне аб будаўніцтве новай святыні. Узводзілі яе доўга — дзесьці каля васьмі гадоў за кошт ахвяраванняў прыхаджан. І вось жыхары аграгарадка дачакаліся радаснай падзеі: 27 лістапада 2017-га храм асвяціў епіскап Слуцкі і Салігорскі Антоній.

Побач з царквой знаходзіцца два гістарычныя будынкі — капліца 1861 года, узведзеная ў гонар адмены прыгоннага права, і званіца 1888 года. З цягам часу святыні рабіліся непрыгоднымі і мелі даволі непрэзентабельны выгляд. Неаднойчы ўзнімалася пытанне аб прывядзенні іх у нармальны стан, паколькі на фоне новага храма яны глядзеліся непрывабна, не ўпісваліся ў агульны пейзаж...

— Складана было вырашыць, з чаго пачаць, — згадвае Алена Мечыслаўна. — Звярталіся і да індывідуальных прадпрымальнікаў, і ў арганізацыі, і на прадпрыемствы, і да былых жыхароў, якія цяпер маюць сваю справу, каб аказалі спонсарскую дапамогу.

Многія адгукнуліся: хтосьці дапамог будаўнічымі матэрыяламі, нехта грашыма. Мясцовы лясгас выдзеліў дрэўцы туі, сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «БетонБокс» забяспечыла пяском. Накрыла дах і атынкавала сцены прыватная фірма з Капыля, якая прапанавала найбольш прымальныя ўмовы разліку. Для гэтых работ было прызначана каля 7 тыс. рублёў — сума больш чым сціплая. Таму і не наймалі буйную арганізацыю, якая ўзяла б за свае паслугі намнога больш.



Старшыня Цімкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Алена ВОСТРЫКАВА і настаяцель мясцовай царквы айцец Міхаіл.

— Нам пашанцавала, што гэтыя помнікі не занесены ў дзяржаўны спіс матэрыяльных каштоўнасцей, таму ад нас не патрабавалася ніякіх узгадненняў з Міністэрствам культуры, — лічыць Алена Вострыкава. — Мы і самі імкнуліся захаваць першапачатковы выгляд будынкаў, архітэктурных элементаў даўніны.

Самы непасрэдны ўдзел у справе прыняў айцец Міхаіл. Ён, можна сказаць, быў і кансультантам, і прарабам, і нароўні з іншымі працаваў на будоўлі. А дырэктар музея імя Кузьмы Чорнага Людміла Ніжынская паехала ў Маскву і прывезла званы цягніком.

Дарчы, айцец Міхаіл служыць у прыходзе каля 20 гадоў. Розныя цуды здараліся за гэты час. Святар паказаў нам ікону Божай Маці з дзіцем на руках і расказаў такую гісторыю. Захварэла ў вёсцы маладая жанчына, урачы вынеслі вердыкт, што жыць ёй засталося лічаныя месяцы, а можа і дні. Куды толькі не ездзіла яна па дапамогу, але цуда не здарылася. І тады яна штодзень пачала прыходзіць да гэтай іконы і маліцца. І Божая Маці пачула яе просьбу. Якім жа было здзіўленне медыкаў, калі праз нейкі час аналізы паказалі, што нават і следу ад той хваробы не засталося...

Адначасова з рамонтам святынь у Цімкавічах запланавалі добраўпарадкаванне тэрыторыі. Справа ў тым, што насупраць царквы стаялі два пустуючыя старыя дамы, якія псавалі агульны пейзаж. Па рашэнні суда іх знеслі, высеклі кусты, выкарчавалі дрэвы на ўчастках, падрыхтавалі зямлю пад сквер з пешаходнай дарожкай. Тут жа ўладкавалі стаянку для аўтатранспарту. Побач з капліцай пралягала непрыгожая, няроўная дарога. Калі вялі падрыхтоўчыя работы, высветлілася, што пад слоем зямлі яна выкладзена камянямі. Расчысцілі, раскапалі, а каб не засыпала пакрыццё грунтам, зрабілі бутавыя бардзюры.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Тэрыторыю каля царквы добраўпарадкоўваюць Надзея САКАЛОЎСКАЯ і Галіна МАРУКОВІЧ.

Дадам, што ў сельвыканкаме працуюць пяць чалавек, але цяпер тут можна застаць толькі дзяжурнага работніка, які вядзе прыём наведвальнікаў, адказвае на званкі. Астатнія разам са старшынёй шчыруюць на «ўсенароднай» будоўлі. Выдзяляюць сваіх людзей і ўстановы сацыяльнай сферы. Вядома, нялёгка працаваць на холадзе, тым больш што работы вядуцца ўручную: раўняюць пясок, грунт, шчэбень. Але саграе душу думка, што гістарычны цэнтр стане камфортным для жыцця і адпачынку. Ужо цяпер, можна сказаць, вымалёўваецца культурна-гістарычны комплекс, які, спадзяюцца мясцовыя жыхары, будзе ўключаны ў раённы турыстычны маршрут Міжрэчча — Мажа. Тым больш што побач знаходзіцца музей Кузьмы Чорнага.

Не сорамна будзе тут ладзіць і масавыя мерапрыемствы, святы. У Цімкавічах заўсёды жылі таленавітыя творчыя людзі. У ансамблі мастацкай самадзейнасці ўдзельнічае і сама старшыня сельвыканкама. Пры музеі працуе тэатральная студыя. Побач знаходзіцца буйная сельская бібліятэка, пры якой мяркуецца ўладкаваць дзіцячую нядзельную школу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

# Ідэальны варыянт — прыход інвестара

**ШТО неабходна рабіць мясцовым уладам для захавання гісторыка-культурнай спадчыны? З такім пытаннем мы звярнуліся да людзей, якія непасрэдна звязаны з гэтай сферай.**

**Галоўны спецыяліст аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Дзяніс ЮРЧАК:**

— Цэнтральнае пытанне заключаецца ў фінансаванні. Многія аб'екты знаходзяцца ва ўласнікаў, а гэта могуць быць тыя самыя сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы. І зразумела, што многія з іх адчуваюць фінансавыя праблемы, таму не могуць дазволіць сабе захоўваць гісторыка-культурную спадчыну. Улічваючы сумны стан многіх аб'ектаў, рацыянальна рэалізоўваць іх на аўкцыёнах, чым мы і займаемся. Ёсць прыклады, калі аб'екты знаходзяцца на балансе сельвыканкамаў, аднак у такім выпадку ў іх можа не быць нават сродкаў на кансервацыю. Вядома, у функцыі мясцовых улад уваходзіць і забеспячэнне неабходнай дакументацыяй: на кожным аб'екце павінна змяшчацца ахоўная дошка, павінен быць пашпарт, але складаецца ён за кошт уласнікаў. І мы за гэтым павінны сачыць. Абласное фінансаванне абмежаванае, таму нам складана дапамагчы тым жа сельвыканкамам. Мясцовыя ўлады могуць наводзіць парадак на тых аб'ектах, якія належаць ім. Але ідэальны варыянт развіцця — прыход зацікаўленага інвестара.

**Намеснік генеральнага дырэктара па рэстаўрацыі і фондавай рабоце Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Сяргей ВЕЧАР:**

— Мы адносімся не да мясцовых улад, а да Міністэрства культуры. Можна сказаць, што Нацыянальны мастацкі музей — гэта брэндавая ўстанова, адзін з вядучых музеяў нашай краіны, які займаецца экспазіцыйнай дзейнасцю як у Беларусі, так і на міжнародным узроўні. Вядома, ва ўсёй нашай дзейнасці мы абапіраемся на разуменне і падтрымку Міністэрства культуры — як у фінансавым плане, так і ў плане праектаў, якія робім. У год культуры ў Ватыкане прайшла наша выстаўка абразоў, у іспанскім горадзе Таледа была экспазіцыя. Цяпер упершыню праходзіць выстаўка арыгінальных карцін беларускіх і рускіх мастакоў XIX і XX стагоддзяў у Пекіне. І ўсе гэтыя праекты без падтрымкі Міністэрства культуры рэалізаваць практычна немагчыма. Акрамя таго, яно дапамагае нам у плане закупкі твораў. Мы папаўняемся і за тыя сродкі, якія выдзяляе міністэрства — падбіраем знакавыя імёны, каб наша калекцыя была найбольш поўнай.

**Дырэктар фонду «Краіна замкаў» Аляксандр ВАРЫКІШ:**

— У кожным рэгіёне свая спецыфіка, як мне здаецца. Магу прывесці прыклад супрацоўніцтва з Ашмянскім раёнам. Там ёсць складанасці з фінансаваннем, аднак кіраўніцтва і розныя службы актыўна ўдзельнічалі ў праекце міжнароднага супрацоўніцтва. Напрыклад, былі распрацаваны міжнародныя веламаршруты, пракладзены веласіпедныя трасы, усталяваны інфармацыйныя стэнды. Падкрэсліваю: улады Ашмянскага раёна вельмі адкрытыя і ахвотна ідуць на супрацоўніцтва. Прычым гэта традыцыйна, а не нейкі апошні павеў. Тут жа можна назваць штогадовы фестываль-рэканструкцыю ў Гальшанскім замку — такіх па краіне ўвогуле засталося няшмат. У мяне абсалютна пазітыўны досвед зносін з уладамі. Дарэчы, мы нават знайшлі інвестара, які купіў старадаўнюю сядзібу 1828 года ў гэтым раёне, а ўлады дапамаглі ўсё аформіць. Так што сістэмных праблем няма наогул.

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» Антон АСТАПОВІЧ:**

— На мой погляд, мясцовыя ўлады фактычна нічога не робяць. Калі нават прааналізаваць у нас тыя ж помнікі археалогіі, то практычна па ўсёй Беларусі яны не праінвентарызаваны — а гэта абавязак мясцовых улад. Калі гаварыць пра помнікі менавіта архітэктуры, то стаўленне да іх выключна фармальнае. А калі рэальна паглядзець, то і не ўсе з іх маюць ахоўныя шыльды. Гэта значыць нават такія крокі далёка не заўсёды выконваюцца. Таму я магу сказаць, што мясцовыя ўлады павінны цалкам перабудоўваць сваю работу ў гэтай сферы. Як? Хай выконваюць заканадаўства, якое цяпер проста ігнаруецца. І трэба яго змяняць, таму што Кодэкс аб культуры ў нас вельмі недасканалы ў раздзеле, які датычыцца менавіта гісторыка-культурнай спадчыны.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# ДА СПАДЧЫНЫ — ТВОРЧЫ ПАДЫХОД

**На жаль, на Лёзненшчыне няшмат помнікаў архітэктуры, гістарычнай спадчыны. Але тое, што засталося, беражліва захоўваецца мясцовай уладай. Усталёўваюцца і новыя помнікі, прысвечаныя славутым землякам, створаны і распрацоўваюцца турыстычныя маршруты.**

## Самы вядомы — Шагал

Дарэчы, да Лёзна зручна дабірацца турыстам, бо райцэнтр знаходзіцца ўсяго за 40 кіламетраў ад Віцебска, — можна даехаць на дызелі, аўтобусах, маршрутках. Расклад руху дазваляе гэта рабіць кожную гадзіну да вечара. Такім чынам, нават тым, у каго няма магчымасці прыехаць на аўто, будзе зручна.

Многія так і робяць, каб убачыць не толькі Віцебск Шагала, але і Лёзненшчыну, дзе, як вядома, жылі яго сваякі. Сусветна вядомы мастак часта бываў тут. На фасадзе ўстановы культуры ў Лёзне на мемарыяльнай дошцы можна прачытаць: «На гэтым месцы знаходзілася сядзіба сям'і, з якой паходзіў мастак Марк Шагал».

Актыўныя ў пытанні захавання і аднаўлення аб'ектаў, якія маюць турыстычныя перспектывы, і сельскія выканкамы. У прыватнасці, у Адаменках, якія побач з Лёзнам, энтузіяст аднаўляе былую панскую сядзібу. І не толькі для сябе.

— Ён набыў дом, частка якога захавалася з дарэвалюцыйнага часу. А ў наваколлі пасля добраўпарадкавання створаны цудоўны парк. І цяпер гэты прыгожы куточак прыроды, дзе, як мяркуецца, любіў гуляць Шагал, таксама натхняе мастакоў, паэтаў, пісьменнікаў, — нагадала **старшыня Лёзненскага сельвыканкама Святлана ПУКАВА.**

На Лёзненшчыне нарадзіўся і ўдзельнік Крымскай і руска-турэцкай войнаў генерал-фельдмаршал Іосіф Гурко. Тут шмат гадоў жыў паэт і фалькларыст Аляксандр Рыпінскі і іншыя... Пра знакамітых выхадцаў з раёна можна даведацца не толькі ў музеі, але і ўбачыўшы «Алею славы», прысвечаную ім.

## Сунічны край

Калі глыбачане ў добрым сэнсе выкарыстоўваюць імідж вішнёвага краю, то на Лёзненшчыне ў якасці брэнда вырашылі прадставіць суніцы. Тэматычныя творчыя ідэі, якія былі рэалізаваны, выклікалі добры рэзананс у СМІ і сярод турыстаў.

А ўсё пачыналася з абласнога фестывалю самадзейных паэтаў і песеннікаў «Песні сунічных бароў». Спачатку ён многія гады насіў статус раённага і праводзіўся ў Доме культуры аграгарадка Дабрамыслі. Удзел у ім бяруць паэты, музыкі, рамеснікі, іншыя творчыя людзі. З мэтай падтрымкі таленавітых асоб у 2014 годзе быў зацверджаны творчы брэнд «Сунічка». Усе ўстановы культуры актыўна ўключыліся ў яго распрацоўку і прасоўванне. За кароткі прамежак часу зрабілі разнастайную фірменную сувенірную прадукцыю. Майстрыхі аднавілі ручнікі пачатку мінулага стагоддзя, у арнаменце якіх ёсць выява суніц. Усё гэта можна ўбачыць у раённым Доме рамёстваў.


Дом культуры ў Лёзне, дзе калісьці жылі сваякі Шагала.





Арыгінальны памятны знак на месцы храма ў Лёзне.

У бібліятэках праводзіцца шэраг тэматычных мерапрыемстваў, прысвечаных брэнду. Народны клуб «Флора» кожны раз здзіўляе незвычайнымі кулінарнымі вырабамі з абавязковым кампанентам — суніцамі. Як кажуць, заўсёды нарасхват сунічны чай. І клубныя ўстановы культуры пры арганізацыі мерапрыемстваў усяляк прапагандуюць творчы брэнд. Пры цэнтры культуры створана аматарскае аб'яднанне «Сунічкі».

Ужо двойчы Лёзненскі раён станавіўся лаўрэатам першай ступені за прэзентацыю брэнда. Гэта было на «Дажынках» у Гарадку ў 2014 годзе і на «Славянскім базары ў Віцебску» ў 2015-м. А ў снежні 2015 года ўручылі прэмію «Сунічка» творчым людзям, якія працягваюць традыцыі продкаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Кітайская мова пашырае сваю прысутнасць

### У Полацкім дзяржаўным універсітэце адкрываецца цэнтр кітайскай мовы і культуры

**Пагадненне аб супрацоўніцтве было падпісана ў красавіку бягучага года. Яно прадугледжвае пашырэнне выкладання кітайскай мовы і знаёмства з культурай Кітая.**

За час, які прайшоў з моманту падпісання пагаднення, полацкія выкладчыкі і студэнты наведалі майстар-класы па мастацтве кітайскай каліграфіі і традыцыйнай цырымоніі чаявання, пабывалі на канцэрце ансамбля Даляньскага ўніверсітэта замежных моў, дзе адбылося знаёмства з музычным фальклорам, народнымі танцамі КНР і майстэрствам ушу. Акрамя гэтага, кіраўніцтва і выкладчыкі ПДУ пабывалі на другім форуме Асацыяцыі навукова-тэхналагічных паркаў зон высокіх і новых тэхналогій «Шаўковы шлях». Студэнты ВНУ прымалі ўдзел у IV Беларуска-кітайскім маладзёжным інавацыйным форуме «Новыя гарызонты — 2017», які прайшоў у пачатку лістапада ў Мінску. Рэалізуючы дамоўленасці, у Полацкім дзяржаўным універсітэце з кастрычніка гэтага года пачалі вывучаць кітайскую мову. Заняткі наведваюць выкладчыкі ўніверсітэта, студэнты і школьнікі. Педагогі — высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія працуюць па сучасных методыках.

Стварэнне цэнтра з'яўляецца важным практычным вынікам рэалізацыі пагаднення паміж партнёрамі — Полацкім дзяржаўным універсітэтам і Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам, на базе якога дзейнічае Інстытут Канфуцыя па навуках і тэхніцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## Натхненне як лекі

Аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў наведала карэспандэнт **«Ляхавіцкага весніка»**. Там людзі займаюцца творчасцю і спортам — такім чынам праходзяць рэабілітацыю. Некаторыя з іх работ можна назваць высокапрафесійнымі. Ужо хутка адправяцца на чарговую выстаўку навагодняя дэкарыраваныя свечкі, калядныя анёлы, ёлачныя цацкі, віншавальныя паштоўкі і шакаладніцы. Усё гэта — ручная праца. Кіраўнікі гурткоў расказваюць, што, напрыклад, у Дзмітрыя Сталярчука цікавы стыль размалёўкі: кожны элемент малюнка заштрыхаваны. Акрамя таго, ён актыўна ўдзельнічае ў тэатральным гурце «Экспромт», дзе займаюцца пастаноўкай казак і мініяцюр. На пачатку снежня акцёры сыгралі сцэнку «Семачкі» на фестывалі творчасці «Кветка сонца» ў аграгарадку Мірны Баранавіцкага раёна.

Работы іншага наведвальніка аддзялення Івана Рашанава паказвалі нават на «Славянскім базары», цяпер многія з іх знаходзяцца на конкурсе ў Брэсце. Яго малюнкі часта ўпрыгожваюць выстаўкі па-за межамі краіны. Ім уласціва лёгкая стрыманасць, піша газета. Асабліва атрымліваецца перарысоўваць архітэктурныя аб'екты: храмы, гарадскія збудаванні. А пачынаў Іван Рашанаў з сюжэтаў дыснееўскіх мультфільмаў.

## Будзьце асцярожныя

У цэху аднаго з прыватных прадпрыемстваў Рэчыцы цяжка траўміраваны 49-гадовы мужчына. Яму ледзьве не разарвала кісць рукі падчас работы на станку, паведамляе раённая газета **«Дняпровец»**. Пры гэтым прадстаўнік наймальніка «Паціка-Экспарт» гаворыць, што названы грамадзянін у іх не працуе. Атрымліваецца, што прыйсці і ўключыць небяспечнае абсталяванне мог кожны ахвотны з вуліцы? На справе, з юрыдычнага пункту гледжання, размова ідзе пра дазвол працаваць на станку без праходжання стажыроўкі і праверкі ведаў па пытаннях аховы працы. Цяпер у гэтай сітуацыі разбіраецца Следчы камітэт.

## Сям'я на прадпрыемстве

Валянціна Кохан працуе на Гарадзейскім цукровым камбінаце амаль 40 гадоў. Прыйшла на завод у 1980 годзе кладаўшчыком. Яе муж Уладзімір — вартаўнік, а дачка Сняжана — начальнік планава-эканамічнага аддзела на



Валянціна КОХАН — супрацоўніца Гарадзейскага цукровага камбіната.

гэтым жа прадпрыемстве. Калектыў ведае Валянціну як працавітага і адказнага работніка, піша газета **«Нясвіжскія навіны»**. Яна нарадзілася ў вёсцы Студзёнкі, цяпер жыве ў Гарадзеі. Жанчына мае сына, дачку і двух унукаў. Сёння Валянціна Кохан працуе лабарантам у грузавіннай лабараторыі: вызначае забруджанасць і цукрыстасць караняплодаў. Падчас нарыхтоўкі працуюць з васьмі раніцы да васьмі вечара. Рытм напружаны. Валянціна лічыць, што трэба да ўсяго ставіцца з аптымізмам, тады жыццё будзе доўгім і шчаслівым.

## Сабака — сябар чалавека?

Круглы стол па праблемах, звязаных з утрыманнем свойскіх жывёл, правяла школьская газета **«Ударны фронт»**. Артур Касцюкевіч, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Шклоўскага раёна, расказвае: «Адсутнасць бадзяжных жывёл на вуліцах з'яўляецца важным момантам у прафілактыцы шаленства. Таму я ўсё ж такі шчыра спадзяюся, што з цягам часу ў нашым горадзе з'явяцца прытулкі для сабак, дзе людзі, якія не маюць магчымасці даглядаць жывёлу, змогуць яе пакінуць, а не выкідваць на вуліцу». Наконт пляцовак для выгулу Артур Касцюкевіч выказаў меркаванне, што іх павінна быць значна больш, знаходзіцца яны павінны ў непасрэднай блізкасці ад жылых дамоў, бо ў людзей няма моцнага жадання ісці з сабакам на вялікую адлегласць. У тых жа месцах, дзе пляцоўкі для выгулу ёсць, добры эфект далі б рэйды, якія дазволілі б выявіць, хто выгульвае сабаку ў належным месцы, а хто не.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ГАРАДСКАЯ ГАСПАДАРКА

# У НАС РЭМАРКА... НА 70 СТАРОНКАХ

## Як зрабіць даступным жыллёвае заканадаўства



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

**АСАЦЫЯЦЫЯ «Эфектыўнае домаўладанне» аб'ядноўвае таварыствы ўласнікаў і арганізацыі забудоўшчыкаў сталіцы. Апошнім часам у асацыяцыю паступаюць шматлікія звароты з просьбай дапамагчы разабрацца ў дзейным заканадаўстве, якое датычыцца кіравання агульнай маёмасцю шматкватэрных жылых дамоў. Як аказалася, адны існуючыя ўказы супярэчаць іншым, а ў дачыненні да тэрмінаў дапушчальныя рознačытанні. Члены асацыяцыі прааналізавалі сітуацыю, засяродзіўшы ўвагу на пытаннях, якія ўзнікаюць найбольш часта, і падрыхтавалі сваю рэдакцыю праектаў Жыллёвага кодэкса і Указа №538, што датычыцца гэтай сферы.**

### Непрымірымае «супраць»

Як расказаў **прадстаўнік асацыяцыі Юрый ВАДЗЯНІЦКІ,** адна з найбольш балючых тэм — прыняцце агульных рашэнняў. На сходы жыхары прыходзіць не хочуць: маўляў, і сваіх праблем хапае. А калі ўсё ж такі прыходзяць, то ўжо ў загадзя дрэнным настроі, таму галасуюць «супраць» у адказ на любую прапанову. Калі нават на сходзе прысутнічае больш за палову жыхароў дома і яны ўдумліва падышлі да праблемы, гэта яшчэ не значыць, што ўдасца «афіцыйна» дамовіцца. Між тым у мінулым годзе ўступіў у сілу ўказ Прэзідэнта, згодна з якім прагаласаваць за прыняцце якога-небудзь рашэння павінны не менш чым 51% ад усіх уласнікаў — замест простай большасці з ліку прысутных, як было раней.

Адной з «ахвяр» новага ўказа стаў дом па адрасе Бурдзейнага, 37 у Мінску. Тут выбраць органы праўлення не могуць ужо два гады. Сход праводзілі неаднойчы, прычым не раз была дасягнута явачная мяжа, але, як кажуць, воз і цяпер там. Змучаныя нявызначанасцю, жыхары вырашылі правесці галасаванне шляхам пісьмовага апытання. У выніку за раней дзеючага кіраўніка таварыства прагаласавала практычна 70% — гэтага дастаткова згодна з заканадаўствам. Аднак 2% жыхароў заявілі, што ім неадпаведным чынам паведамілі аб правядзенні апытання, хоць самі падпісалі адмову ад уручэння паведамлення. Раённая адміністрацыя ўстала на бок незадаволеных жыхароў.

> Аб'ём напрацаванага асацыяцыяй «Эфектыўнае домаўладанне» матэрыялу вымяраецца сотнямі старонак. Толькі да Указа №538 яны падрыхтавалі 70 лістоў каментарыяў і прапаноў па яго паляпшэнні.

Тым часам, калі таварыства не можа вызначыцца самастойна, кіраванне жылым домам пераходзіць да ўпаўнаважанай асобы ад дзяржаўнага заказчыка ў сферы аказання жыллёва-камунальных паслуг. Так адбылося і ў названым доме па вуліцы Бурдзейнага ў студзені гэтага года. Аднак узнікла чарговае пытанне: упаўнаважаная асоба кіруе агульнай маёмасцю, але не таварыствам уласнікаў. Гэта значыць яна не мае доступу да асабовага рахунку, таму не можа выплачваць зарплату іншым супрацоўнікам. На гэтыя патрэбы ідуць шматгадовыя назапашванні таварыства. Іх атрымліваюць, напрыклад, здаючы ў арэнду памяшканні на першым паверсе дома пад крамы, цырульні ці офісы або змяшчаючы рэкламу на сценах дома.

Аднак і гэтыя назапашванні маюць уласцівасць заканчвацца. На пытанне, як дзейнічаць у такой сітуацыі, асацыяцыя спрабуе знайсці адказ у розных інстанцыях: ад раённага кіраўніцтва, профільных Міністэрстваў да Савета міністраў і Адміністрацыі Прэзідэнта. Пакуль не вельмі паспяхова, але барацьба, як называюць яе самі ініцыятыўныя гараджане, працягваецца.

### Сарафаннае радыё як пагроза

Аб'ём напрацаванага асацыяцыяй «Эфектыўнае домаўладанне» матэрыялу вымяраецца сотнямі старонак. Толькі да Указа №538 яны падрыхтавалі 70 лістоў каментарыяў і прапаноў па яго паляпшэнні. Сам Юрый Вадзяніцкі марыць аб больш радыкальных спосабах вырашэння праблемы: утапічным горадзе, дзе б дамы засялялі ў адпаведнасці з жаданнем уладальнікаў кватэр удзельнічаць у добраўпарадкаванні агульнай тэрыторыі. Маўляў, хочаш жыць добра — будзь гатовы плаціць і не быць абыякавым, не хочаш — тваё права.

Пакуль жа таварыствам уласнікаў існаваць няпроста: запазычанасці па плацяжах даводзіцца аплачваць самім, без дзяржаўных субсідый. Адсюль і шматлікія пытанні да старшынь таварыстваў: куды ідуць нашы грошы? Юрый Вадзяніцкі прыводзіць прыклад дзеяння сарафаннага радыё: сястра і брат жывуць у аднолькавых дамах, толькі адным кіруе таварыства ўласнікаў, а другім — упаўнаважаная асоба ад ЖРЭА. Сваякі параўноўваюць жыроўкі і выяўляюць «нядобрае»: адзін з іх істотна пераплачвае, скажам, за карыстанне ліфтам.

— Прэтэнзіі да каго? Да старшыні таварыства. А павінны быць — да нядобрасумленных суседзяў. Бо менавіта іх запазычанасці раскідваюць на астатніх членаў таварыства, у той час як у іншых выпадках гэтыя сумы пакрывае дзяржава, — тлумачыць прадстаўнік асацыяцыі.

Яшчэ адна распаўсюджаная прэтэнзія — немэтазгоднае расходаванне грашовых сродкаў, прызначаных на капітальны рамонт, на які, дарэчы, усе мы робім штомесячныя выплаты. Гэтыя грошы ідуць спачатку на дэпазітны рахунак. Але справа ў тым, што тэрмін дзеяння ўкладаў — ад 3 да 12 месяцаў, пасля чаго іх можна перавесці на разліковы рахунак таварыства, адтуль іх ужо аўтаматычна спісваюць на заработную плату або на аплату паслуг пастаўшчыкоў. Атрымліваецца, што на капітальны рамонт людзі адкладваюць гадамі, а калі справа да яго ўсё ж такі даходзіць, даводзіцца зноў адкрываць свае кашалькі.

— <u>Неабходна, каб нарматыўна-прававыя акты былі адназначнымі, не дапускалі рознačытанні і, самае галоўнае, не супярэчылі адзін аднаму</u>, — падкрэсліў Юрый Вадзяніцкі. — Гэтае пытанне зараз стаіць даволі востра. Мне здаецца, што, калі людзі самі хочуць займацца сваім жыллём, гэтую ініцыятыву трэба заахвочваць, тым больш што такі падыход выгадны для дзяржавы. Так, мы бяром на сябе частку работ ЖРЭА, але ў той жа час, як я ўжо падкрэсліваў раней, аплачваем запазычанасці за камунальныя паслугі без дапамогі, што ўсё ж больш значна для бюджэту.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

СВАЕ СЯРОД СВАІХ

# ГРАМАДСКАЯ НАГРУЗКА — СПРАВА НЯПРОСТАЯ

**Жыхары вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна больш за дзесяць гадоў выбіраюць старастай аднаго і таго ж чалавека. Валянціна БОБРЫК раней працавала настаўніцай і пасля выхаду на пенсію не змагла доўга заставацца без справы. Цяпер жанчына працуе выхавальніцай у дзіцячым садку і адначасова клапоціцца, каб вяскоўцам было зручна жыць.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работа старасты — сувязь паміж уладамі і вяскоўцамі. У сельвыканкам Валянціна Дзянісаўна ходзіць амаль кожны дзень, слухае, якія рашэнні там абмяркоўваюцца, а потым простай мовай перадае пачутае аднавяскоўцам. Адпаведна, калі ў сяльчан з'яўляюцца праблемы, вырашыць якія ўласнымі сіламі немагчыма, стараста паведамляе пра іх у сельвыканкам.

Грамадская нагрузка, калі да яе ставіцца сур'ёзна, справа няпростая. Усе самыя запатрабаваныя заканадаўчыя акты і дэкрэты, парадак уладання маёмасцю пажадана ведаць на памяць. Стараста кантралюе добраўпарадкаванне, вулічнае асвятленне, гуманітарную дапамогу, наведванне праблемных сем'яў і многае іншае. «Мудрасць прыходзіць з гадамі. Чалавек адчувае, што здатны на большае, і прыкладвае энергію ў плённае рэчышча. Сярод вяскоўцаў такія людзі карыстаюцца аўтарытэтам», — расказвае **Алена ШПАКЕВІЧ, старшыня Юркевіцкага сельскага Савета дэпутатаў.**

У ліпені колькасць жыхароў у Юркевічах «вырастае» ўдвая. Каля 600 чалавек штогод збіраюцца тут на Свята вёскі, якое паспела ператварыцца ў сапраўдны фестываль беларускай песні. Некаторыя госці нават адпачынак прымяркоўваюць да асаблівай даты ці спецыяльна купляюць білеты з Мінска, Масквы, Смаленска. Ініцыятыўная стараста не толькі прапануе, каго са знакамітых артыстаў можна было б запрасіць. Яна дапамагае прывозіць людзей з суседніх вёсачак, каб і тыя змаглі адпачыць сярод гасцінных суседзяў, і нават сама выступае ў хоры народных выканаўцаў.

Да Валянціны Дзянісаўны звяртаюцца і з «дробнымі» пытаннямі. Напрыклад, у выпадках, калі трэба купіць насеннай бульбы, калі суседская карова нарабіла шкоды ў агародзе, калі дрэва небяспечна нахілілася над агароджай...

А бывае, што на вуліцы пажылая жыхарка мімаходзь паскардзіцца, што ў хаце пахне газам, і стараста адкладае ўласныя справы, каб тэрмінова патэлефанаваць газавікам.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

ПРАБЛЕМА І РАШЭННЕ

# НА КАРЦЕ ЯШЧЭ ПАЗНАЧАНЫ...

## Што рабіць з вёскамі, у якіх ніхто не жыве

**На Міншчыне, зрэшты, як і ў іншых абласцях краіны, ёсць населеныя пункты, назвы якіх пазначаны толькі на карце. А фактычна тут даўно ніхто не жыве. З цягам часу прыйшлі ў заняпад гаспадарчыя пабудовы, а падворкі зараслі хмызняком і пустазеллем.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Даволі нядаўняга часу непрывабна выглядала вёска Пнівада ў Капыльскім раёне. Паўразбураныя пабудовы, баршчэўнік — у чалавечы рост, вакол смецце.

— Наш раён вялікі, у ім налічвалася 210 сельскіх населеных пунктаў і райцэнтр. Цяпер жа засталося 208, — расказала **старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Ірына КІСЛЯК.** — Сёлета рашэннем сесіі райсавета скасавалі дзве вёскі. У Пацейкаўскім сельсавеце цалкам знеслі вёску Пнівада.

Яшчэ гадоў дзесяць таму тут заставалася адна жыхарка. Але дачка забрала яе да сябе ў Расію, а праз тры гады жанчына памерла. З цягам часу вёска прыходзіла ў запусценне: дамы, хлеўчукі, падсобныя памяшканні гнілі, разбураліся літаральна на вачах. На частку домаўладанняў спадчыннікі ў ўласнікі не знайшліся, а некаторыя адмовіліся ад спадчыны, паколькі ад радавога гнязда засталіся толькі рэшткі, і рамонт быў немэтазгодны. Перш чым вёску знесці, правялі грамадскія апытанні, растлумачылі людзям, што могілкі застаюцца, іх будзе даглядаць сельвыканкам.

У мясцовага органа ўлады для ўпарадкавання тэрыторыі не было магчымасцяў. А зрабіць трэба было шмат: знесці дамы, гаспадарчыя пабудовы, выкарчаваць дрэвы, кусты, рэкультываваць зямельныя ўчасткі і ўвесці іх у грамадскі севазварот. На дапамогу прыйшлі адзінаццаць арганізацый раёна, якія мелі людскія, матэрыяльныя, тэхнічныя рэсурсы. Вёска ўмоўна была падзелена на зоны, замацаваныя за кожнай з гэтых арганізацый. Вынік — цяпер на месцы былой вёскі зеленяюць азімыя.

Навялі парадак і ў вёсцы Савічы, дзе калісьці была сядзіба Эдварда Вайніловіча. На гэтым месцы захаваліся толькі руіны піваварні. Але сюды прыязджаюць турысты, госці. І населены пункт павінен сустракаць іх адпаведным чынам. Таму было прынята рашэнне па знасе пустуючых дамоў, рэкультывацыі зямельных участкаў і ўвядзенні іх у севазварот.

**Калісьці Савічы былі вялікім населеным пунктам. А цяпер, па даных на 1 студзеня, налічваецца 15 уласных падсобных гаспадарак і 28 жыхароў — усе непрацаздольнага ўзросту.**

КОЛЬКАСЦЬ насельніцтва ў раёне катастрафічна змяншаецца — засталося 28 тыс. 200 чалавек. Многія вёскі старэюць, гаспадары паміраюць. Натуральна, адны пабудовы зносяцца — з'яўляюцца іншыя.

— Сёлета раёну было дадзена заданне знесці 125 пустуючых дамоў, у сапраўднасці знесена 170. Да канца года лічба павялічыцца, — упэўнена Ірына Кісляк. — У вёсцы Калінаўка, што знаходзіцца ў Доктаравіцкім сельсавеце, летась жыллёва-камунальная гаспадарка дапамагла выкарчаваць кусты, спілаваць дрэвы. Засталося прыбраць рэшткі 10 дамоў, а захаваліся тут толькі тры жылыя.

Па словах Ірыны Кісляк, цяжкасць у тым, што сёння арганізацыі, якія маюць спецыялізаваную тэхніку, просяць за свае паслугі вялікія грошы. Такіх сродкаў у сельвыканкамаў няма. Таму ў раёне вызначаюць прыярытэты па кожным з сельсаветаў. У прыватнасці, вызначыліся з правядзеннем у наступным годзе раённых «Дажынак» у аграгарадку Доктаравічы. Туды і накіроўваюць грошы на добраўпарадкаванне, знос пустых дамоў.

— Акрамя зносу, мы аптымізуем зямельныя ўчасткі. Ужо абследавалі 1182 з іх плошчай каля 93 гектараў. Калі ў доме ніхто не жыве — зямля зарастае. Мы проста абкошваем, падтрымліваем парадак на падворку, агародах. Хоць не маем права ступіць нават за вароты — гэта незаконна. Але вымушаны гэта рабіць, каб падтрымліваць мінімальны парадак. У той жа час мы не маем права аштрафаваць спадчыннікаў. Шукаем іх, пасылаем фотаздымкі з непрыглядным станам бацькоўскіх сядзіб. Толькі за гэты год выдадзена 2965 прадпісанняў. Але прыцягнуць людзей да адказнасці не можам — у заканадаўстве гэта не прадугледжана. («МС» неадноўчы ўзнімала гэту праблему. — **Аўт.**)

**Афармляць на сябе дамы спадчыннікі не спяшаюцца. Неабходна будзе плаціць падаткі на зямлю, нерухомасць, самастойна рамантаваць або зносіць стары будынак. Многія аднеквацца: маўляў, няхай стаіць, магчыма, некалі прыеду сюды жыць. Але пакуль ён прыедзе, ад сядзібы нічога не застанецца.**

— Калі б у заканадаўстве было дакладна прапісана: чалавек, які не працягу трох-чатырох гадоў не ўступіў у правы спадчыны, павінен афіцыйна напісаць адмову ад яе, гэта значна аблегчыла б работу сельвыканкамаў, — лічыць Ірына Кісляк.

У раёне сутыкнуліся з наступным выпадкам. Тры гады таму раённым судом адзін дом быў прызнаны пустуючым, яго знеслі. Але затым з'явіўся спадчыннік, які заявіў, што не хацеў зносіць радавое гняздо. Вярхоўны суд адмяніў рашэнне ніжэйшай інстанцыі, і давялося заплаціць заяўніку 45 млн рублёў. Прычым падаткі на зямлю, нерухомасць чалавек не плаціў гадамі. Не адгукнуўся ён і тады, калі даваліся аб'явы ў газету, не адказваў на папярэдджанні, што дом заносіцца ў рэгістр пустуючых. Не выключана, што такім чынам вырашыў падзарабіць.

Пра навядзенні парадку на зямлі добра працуюць усе дзесяць сельскіх Саветаў дэпутатаў.

— Цімкавіцкі сельвыканкам рэалізуе сумесны з ПРААН праект па гістарычным адраджэнні цэнтра аграгарадка Цімкавічы. У Доктаравіцкім сельсавеце плануюць зрабіць парк, ужо знеслі старыя пабудовы, вызвалілі тэрыторыю ад аварыйных таполяў. Бабаўнянскі сельсавет прыступіў да расчысткі пустуючых участкаў. У наступным годзе храму ў вёсцы Дзялядавічы спаўняецца 220 гадоў — з гэтай нагоды будуць праходзіць набажэнствы, святкаванні. Таму вёска павінна годна сустрэць гасцей і вернікаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

**У тэму**

**Іван ЛІПНІЦКІ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— У Мінскай вобласці налічваецца 80 вёсак, дзе ніхто не жыве. Сюды ніхто не прыязджае нават налета. Мясцовыя органы ўлады могуць прымаць рашэнне аб скасаванні такіх вёсак у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1998 года "Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні Рэспублікі Беларусь" у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 года. Робіцца гэта для таго, каб навесці парадак на зямлі. У былых вёсках, як правіла, дамы даўно згнілі, праваліліся гаспадарчыя пабудовы. Яны зносяцца, участкі пасля рэкультывацыі ўводзяцца ў севазварот сельгасарганізацый. Вядома, для гэтага неабходныя вялікія сродкі, якія трэба прадугледжваць у бюджэтах раёнаў.

ЗДАРЭННІ

## А не паклёпнічай!

**Ёсць людзі, якія ў жаданні адпомсціць каму-небудзь спрабуюць чалавека абгаварыць. Напэўна, не ведаючы, што заведама лжывы данос караецца па законе. Толькі за 10 месяцаў гэтага года ў Магілёўскай вобласці было распачата 25 крымінальных спраў у адносінах да такога роду правапарушальнікаў, паведаміў начальнік аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці па наглядзе за дазнаннем Яўген НЕПША.**

У спісе 29-гадовая бабруйчанка, якая пасля распіцця спіртных напояў запатрабавала ў знаёмай вярнуць ёй доўг — 75 рублёў. А калі тая праігнаравала ўльтыматум, раззлаваная жанчына набрала нумар «102» і паведаміла аб крадзяжы ў яе 2000 еўра. Гэтыя ж прэтэнзіі яна прад'явіла да таварышкі і ў прысутнасці следча-аператыўнай групы, якая прыехала па яе сігнале. Пасля яна ўсё ж такі прызналася, што грошы ў яе ніхто не краў, але гэта ўжо не пазбавіла яе ад адказнасці. Рашэннем суда Бабруйскага раёна і Бабруйска жанчына прызнаная вінаватай у здзяйсненні злачынства, прадугледжанага першай часткай артыкула 400 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Заведама лжывы данос каштаваў ёй 30 базавых велічынь — 690 рублёў. Дарэчы, санкцыя гэтага артыкула прадугледжвае пакаранне да пяці гадоў пазбаўлення волі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Залезлі ў дом, патрабавалі грошы

**Да жыхаркі Баранавічаў, дом якой стаіць на ўскраіне горада, прыкладна ў чатыры раніцы ў пятніцу залезлі невядомыя мужчыны ў масках. Яны звязалі гаспадыні рукі, пагражалі пісталетам і бейсбольнай бітай, патрабавалі грошы. А потым кінуліся самі абшукваць дом. Яна скарысталася тым, што зламыснікі страцілі пільнасць, змагла неяк развязаць рукі і націснула трывожную кнопку. Добра, што дом быў аснашчаны сігналізацыяй.**

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога УУС Сяргей ДУЧЭНКА,** супрацоўнікі Дэпартамента ахоўвы прыбылі на месца праз тры хвіліны, але зладзеі паспелі ўцячы. Цяпер вядзецца іх пошук. Заведзена крымінальная справа па факце разбою, здзейсненага групай асоб.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## За шчупакоў забралі машыну

**Жыхара Салігорскага раёна суд прызнаў вінаватым у незаконнай транспарціроўцы рыбы, прызначыў яму штраф і пазбавіў аўтамабіля.**

Сёлета ў сакавіку мужчына прыехаў на Краснаслабодскае вадасховішча парыбачыць. Па яго словах, рабіць гэта ён збіраўся законным спосабам. Тым не менш у машыне рыбака работнікі Нясвіжскай міжрайінспекцыі знайшлі мех з 25 кілаграмамі шчупака (44 асобіны), хоць у той час была ўстаноўлена нераставая забарона на яго вылаў. А ў адносінах да парушальніка завялі крымінальную справу за транспарціроўку. Суд пастанавіў канфіскаваць у вінаватага аўтамабіль «опель», на якім мужчына збіраўся перавозіць незаконны ўлоў. Апроч таго, яму трэба будзе выплаціць 4 тысячы рублёў штрафу. А да гэтага моманту пад арыштам застаюцца канфіскаваныя ў парушальніка лодка і iPhone.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 5 снежня 2017 года.**